16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 27 (5236) 7 ліпеня 2023 г.

ISSN 0024-4686

Натхняльнае адчуванне адкрыцця стар. 4—5

Свет яснага слова стар. 6



Сувязь манументальнага і камернага стар. 13

Пад шатамі старой ліпы

Фота даслана Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы.

Помнік «Восень паэта» ў Ляўках.

Цёплая, сяброўская, добразычлівая атмасфера панавала на святе ў Ляўках «Купала заўсёды ў маім сэрцы», прымеркаваным да дня нараджэння народнага паэта Беларусі, а таксама да 45-годдзя Купалаўскага мемарыяльнага запаведніка. Святочную праграму з удзелам знакамітых пісьменнікаў, прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, музычных калектываў і выканаўцаў падрыхтаваў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы пры падтрымцы аддзела культуры Аршанскага райвыканкама.

Творы на словы незабыўнага песняра гучалі ў выкананні ганаровых гасцей літаратурна-музычнай імпрэзы: заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Нацыянальны акадэмічны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь імя М. Я. Фінберга», лаўрэатаў міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, заслужаных артыстаў Рэспублікі Беларусь. Да помніка Янку Купалу ўсклалі кветкі.

Па словах Галіны Варонавай, вучонага сакратара Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, адной з удзельніц свята, гэты дзень стаў цудоўным сямейным адпачынкам для яго гасцей. Нават дождж не перашкодзіў адчуць асалоду судакранання з асобай песняра — аматары творчасці Янкі Купалы знайшлі прытулак пад шатамі старой раскідзістай ліпы, якая, магчыма, была сведкам яго прысутнасці ў гэтым жыццядайным куточку беларускай зямлі.

«ЛіМ»-акцэнты

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў беларускі народ з Днём Незалежнасці. «Гэтае свята — даніна пакаленням беларусаў, якія на працягу стагоддзяў адстойвалі права жыць на роднай зямлі і самастойна вызначаць уласны лёс, — адзначаецца ў віншаванні. — Яно захоўвае памяць пра бяспрыкладны подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дэманструе гістарычную сталасць, нацыянальную годнасць і цвёрдую волю спадчыннікаў народа-пераможцы ўмацоўваць сваю дзяржаўнасць». Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што духоўны, маральны, інтэлектуальны, эканамічны базіс дае беларусам магчымасць з упэўненасцю глядзець у будучыню і падкрэслівае, што народнае адзінства, добрасумленная праца і беражлівае стаўленне да сваёй зямлі з'яўляюцца залогам дасягнення самых запаветных мэт.

• Кіраўнік дзяржавы павіншаваў жыхароў Нясвіжа і Нясвіжскага раёна з 800-гадовым юбілеем горада. «Нясвіж — горад-легенда, калыска беларускага кнігадрукавання, тэатральнага, мастацкага і музычнага мастацтва, каштоўная жамчужына на карце Беларусі. Яго архітэктурную прыгажосць і культурныя багацці стагоддзямі стваралі многія пакаленні нашых продкаў. Штогод сюды накіроўваюцца сотні тысяч турыстаў, каб дакрануцца да самабытнай і яркай гісторыі мудрага, таленавітага і працавітага беларускага народа», — гаворыцца ў віншаванні. Прэзідэнт Беларусі таксама падкрэсліў, што Нясвіжскі раён сёння адыгрывае важную ролю ў сацыяльна-эканамічным развіцці Мінскай вобласці, з'яўляючыся лідарам у вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. У аснове гэтых высокіх дасягненняў — беражлівае стаўленне да сваёй зямлі і любоў да малой радзімы жыхароў рэгіёна.

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народную артыстку Расіі Дзіяну Гурцкую з днём нараджэння. «Выдатны талент, аграны віртуозным майстэрствам, і нязломны характар, загартаваны многімі жыццёвымі выпрабаваннямі, далі магчымасць вам стварыць свой непаўторны стыль і стаць прыкладам для мільёнаў паклоннікаў, — падкрэслівае кіраўнік дзяржавы. — Асобную павагу выклікаюць ваша грамадзянская пазіцыя, актыўная грамадская і дабрачынная дзейнасць, накіраваная на аказанне падтрымкі маладым талентам». Аляксандр Лукашэнка пажадаў народнай артыстцы добрага здароўя, поспехаў і натхнення. «Няхай Ваша плённая праца і ў далейшым прыносіць людзям радасць, садзейнічае ўмацаванню дружбы паміж нашымі краінамі», — дадаў Прэзідэнт.

Афіцыйна. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сродках масавай інфармацыі"». Дакумент накіраваны на ўдасканаленне механізмаў абароны нацыянальных інтарэсаў у медыясферы, а таксама на пашырэнне інструментаў для рэагавання на недружалюбныя дзеянні адносна Беларусі. Законам прадугледжваецца магчымасць увядзення забароны на дзейнасць замежных СМІ на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у выпадку праяўлення замежнымі дзяржавамі недружалюбных дзеянняў у адносінах да беларускіх СМІ. Прадугледжана таксама вызначэнне асаблівасцей функцыянавання агрэгатараў навін і прававога статусу іх уладальнікаў. Пашыраецца пералік падстаў для анулявання пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі СМІ і абмежавання доступу да інтэрнэт-рэсурсу, сеткавага выдання, агрэгатара навін. Устанаўліваюцца патрабаванні да дзейнасці ўладальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў, якія распаўсюджваюць прадукцыю тэлевізійных і (або) радыёвяшчальных СМІ.

Фестываль. Песня Ігара Лучанка «Беларуская сталіца», якую ён некалі выканаў у Віцебску непасрэдна з паперы, прагучыць на цырымоніі адкрыцця XXXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Аб гэтым на прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы паведаміла рэжысёр урачыстага адкрыцця форуму Агата Мацко. Адным з галоўных падчас мерапрыемства стане блок, прысвечаны вядомым кампазітарам, песням, якія сёлета адзначаюць юбілей. «Цэнтральнай фігурай гэтага блока будзе Ігар Міхайлавіч Лучанок. Мы падабралі нумар — прагучыць песня "Беларуская сталіца", якая была прэзентавана Ігарам Міхайлавічам на сцэне Летняга амфітэатра, калі быў яго вялікі юбілейны канцэрт, і ён яе выканаў непасрэдна з паперкі каля раяля. Гэтыя кадры мы таксама пакажам у амфітэатры. Песню выканае народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка. Спадзяёмся, што песня будзе далей жыць і атрымае свой працяг», — адзначыла Агата Мацко.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Адказнасць за слова

Штомесячна праходзяць на Гомельшчыне абласныя семінары паэзіі і паэтычных перакладаў, прозы і драматургіі. Іх тэматычная праграма прадугледжвае знаёмства як з тэарэтычнымі звесткамі і даследаваннямі, так і са шматлікімі рэцэнзіямі, водгукамі на новыя мастацкія творы і кнігі, якія выйшлі з друку апошнім часам.

Чэрвеньскі семінар прозы і драматургіі на базе аддзела літаратуры па мастацтве абласной універсальнай бібліятэкі імя У. І. Леніна пачаўся з прэс-прэзентацыі сумеснага зборніка гомельскіх і бранскіх літаратараў «Пад небам адзіным. Под небом единым», выдадзенага да традыцыйнай сустрэчы пагранічных абласцей «Славянскае адзінства» абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі. Як адзначыў яго ўкладальнік Уладзімір Гаўрыловіч, творчасць літаратараў дзвюх краін уносіць значны ўклад ва ўмацаванне добрасуседства, дружбы і супрацоўніцтва між народамі Беларусі і Расіі. Вялікая сумесная прэзентацыя зборніка, у якім змешчаны творы больш як 60 пісьменнікаў, адбудзецца ўвосень на XVIII Міжнародным фестывалі-свяце «Славянскія літаратурныя Дажынкі».

Кіраўнік семінара прозы, празаік і мастацтвазнаўца, Алег Ананнеў зрабіў аналіз калектыўнага зборніка прозы «Подых часу» (2023), прысвечанага Году гістарычнай памяці. Ён адзначыў, што мастацкі ўзровень твораў зборніка розны.

Шмат цікавых гістарычных фактаў пра баявы шлях Героя Савецкага Саюза Мікалая Сяргеевіча Арлова (сапраўднае імя — Гатаула Мірзагітавіч Мінаеў) данесла да чытача ў сваёй новай кнізе «Апаленыя вайной» яго дачка, кіраўнік Петрыкаўскага літаб'яднання Любоў Арлова. Гэта адзначыла рэцэнзент Тамара Кручэнка.

Няпроста і адказна пісаць пра прыроду і жывёльны свет для дзяцей і падлеткаў. У гомельскага празаіка Тацяны Маісеевай (па адукацыі яна біёлаг і эколаг) гэта атрымліваецца ярка, запамінальна і пазнавальна, адзначыла Наталля Шастакова, якая зрабіла аналіз кнігі пісьменніцы «Як няпроста зайцам быць!..» (2023).

Зацікавіць юнага чытача ўмее Вера Квяткоўская, канстатавала рэцэнзент Ала Бялькова, аналізуючы кнігу гомельскай паэтэсы і празаіка «Пушысты будзільнік», выдадзеную сёлета ў выдавецтве «Гомельская праўда». Там апісаны падзеі, пра якія расказваюць самі дзеці.

На форуме звярнуліся і да разгляду твора маладога аўтара Яніны Берасневай (Корбут). Яе кніга — авантурны дэтэктыў «Любімыя па-за законам». На думку Наталлі Шамятковай, якая выступіла рэцэнзентам, гісторыя гэтая хавае нямала таямніц з жыцця герояў — нашых сучаснікаў.

Асобна спыніліся на ўдзеле прафесійных аўтараў і перакладчыкаў-аматараў рэгіёна, якія дасканала валодаюць беларускай мовай, у новым міжнародным праекце, што распачынае пісьменніцкая арганізацыя вобласці — міжнародны конкурс перакладаў «Мір Каўказу», а таксама на іншых конкурсах, што праводзяцца ў літаратурнай прасторы Беларусі і замежжа і дазваляюць раскрыць свой творчы патэнцыял кожнаму, хто сур'ёзна працуе са словам.

Завяршыўся шматпланавы семінар прозы і драматургіі абмеркаваннем праграмы наступнага форуму.

Мікалай ПРЫПЯЦКІ

прэзентацыі

Кніга — найлепшы дар

У Гомельскім палацава-паркавым ансамблі адбылася вечарына сямейнага чытання. Удзельнікі мерапрыемства прэзентавалі кнігу «Бацькоўскі дар», у якой змешчаны творы класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Выданне пабачыла свет летась па ініцыятыве Беларускага саюза жанчын.

На вечарыну былі запрошаны сем'і з прыёмнымі дзецьмі, дамоў сямейнага тыпу, бібліятэкары і прадстаўнікі пярвічнай арганізацыі Беларускага саюза жанчын, іншых грамадскіх арганізацый.

Спікеры — намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Алейнікаў, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Гаўрыловіч, старшыня абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын, кіраўнік спраў аблвыканкама Алена Клічкоўская, а таксама госці з Мінска — дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Лілія Ананіч і дырэктар выдавецтва «Народная асвета» Вікторыя Калістратава — прачыталі ўрыўкі з твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа, расказалі прысутным, чаму важна чытаць кнігі ўсёй сям'ёй, а таксама падарылі абласной бібліятэцы свае любімыя выданні.

Так, Уладзімір Гаўрыловіч прэзентаваў галоўнай кніжніцы вобласці кнігу ўспамінаў Даніла Граніна. Пяці шматдзетным сем'ям з кожнага раёна горада Гомеля ён уручыў па дзве свае кнігі прозы «Там, дзе цячэ Пуць-рака…» і «Анёлак мой, Анёлак…», пажадаўшы дзецям і дарослым шчаслівай будучыні.

Як адзначалі выступоўцы, у наш час, калі падлеткаў уцягвае ў свае сеткі інтэрнэт, сямейнае чытанне высокамастацкіх кніг павінна стаць добрай традыцыяй. Дзеля гэтага прыкладаюць свае намаганні і грамадскія арганізацыі Беларусі.

Улад ПРЫАЗЁРНЫ
Фота даслана аўтарам

радзіннае

Сведкі часу

30 чэрвеня ў пасялковай бібліятэцы Езярышча Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці адбылася сустрэча з пісьменніцай Наталляй Саветнай. Мерапрыемства насіла назву «Нашы землякі — героі кніг», таму што героі аповесцей, апавяданняў, раманаў і нарысаў Наталлі Віктараўны — жыхары Беларусі і Гарадоччыны.

Вось і ў Езярышчы жыве адна з яе гераінь, якой на сёння ўжо 104 гады. Гэта Наталля Арсенцьеўна Каранчукова, пра якую расказваецца ў аповесці «Дацягнуць да вясны» (рыхтуецца да публікацыі ў часопісе «Нёман»). Наталля Арсенцьеўна захавала ясны розум, фізічную сілу і здароўе і здзівіла ўсіх сваёй памяццю, выразнай прамовай, хвалюючымі ўспамінамі. Яе аповед пра тое, як пачалася вайна, што давялося перажыць, уразіў слухачоў — такіх сведкаў таго часу практычна не засталося.

Выстаўка кніг Наталлі Саветнай, падрыхтаваная супрацоўнікамі бібліятэкі, атрымалася досыць прадстаўнічай. А кнігі «Пучок травы», «Затоенае слова» і «Крэмень», якія распавядаюць пра гераічны дух і веру ў перамогу мірных жыхароў Гарадоччыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, выклікаюць асаблівую цікавасць, бо па іх можна вывучаць гісторыю ваенных дзеянняў у гэтых мясцінах.

Разам з пісьменніцай у Езярышча прыехала музыкант, выканаўца, актрыса Мінскага гарадскога тэатра паэзіі СП Наталля Хадкевіч. Для яе гэтая паездка была асабліва важная, бо яе радавыя карані з Езярышчанскага краю. Выконваліся песні, напісаныя на словы Наталлі Саветнай, былі прачытаны вершы з кнігі «Затоенае слова», прысвечаныя спаленай разам з жыхарамі вёсцы продкаў аўтара — Падрандзе, якая не адрадзілася пасля Вялікай Айчыннай. На яе месцы сям'я Наталлі Саветнай усталявала памятны крыж з таблічкай, на якой — звесткі пра страшныя падзеі 1942 года і гэты верш.

Абыякавых на сустрэчы з пісьменніцай не было. Задавалі пытанні, дзяліліся ўражаннямі аб прачытаным. Многія захацелі набыць кнігу, а хтосьці — проста падпісаць тую, якую ўжо меў, бо кнігі з дня выхаду з друку шчодра раздорвала ўнучка гераіні аповесці «Дацягнуць да вясны» Наталля Ганчарова, кандыдат навук, якая жыве і працуе ў Маскве. Пры яе актыўным садзейнічанні кніга «Крэмень» пабачыла свет.

Зоя ШАЛЫГА

імпрэзы

Песня і Радзіма застаюцца

У дні святкавання 65-годдзя горада Наваполацка сярод яго шаноўных гасцей быў Навум Гальпяровіч — ганаровым грамадзянін Полацка і Наваполацка.

У цэнтральнай бібліятэцы імя У. Маякоўскага ладзіліся сустрэча з пісьменнікам і прэзентацыя кніг «Горад» і «Ветразь лёсу», якія папоўнілі мясцовыя кніжныя фонды. Імпрэза распачалася з верша «Застаюцца песня і Радзіма», што даў назву мерапрыемству.

З некаторымі творамі пісьменніка пазнаёміла выстаўка, якую падрыхтавалі супрацоўнікі бібліятэкі да сустрэчы са знакамітым земляком. Асабліва вабяць юных чытачоў кнігі серыі «Гарады і гістарычныя мясціны Беларусі», складальнікам якой з'яўляецца Навум Якаўлевіч. З цікавасцю чытаюць паэзію і прозу аўтара дарослыя.

Навум Гальпяровіч.

Паўтары гадзіны Навум Якаўлевіч быў нашым суразмоўцам, прыгожа і эмацыянальна чытаў свае вершы і апавяданні, распавядаў пра жыццё, адказваў на пытанні слухачоў, пакідаў аўтографы на памяць на палях сваіх кніжак.

Навум Гальпяровіч дваццаць гадоў жыў і працаваў у Наваполацку, амаль столькі ж жыве і працуе ў Мінску, але знаходзіць час, каб падтрымаць таленавітых землякоў, дапамагчы добрымі парадамі і справамі. Нашай паэтцы Іне Мароз даў рэкамендацыю ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. На вечарыне яна падзялілася ўражаннямі ад кнігі «Горад». Полацкая паэтэса Наталля Літвінава прысвяціла Навуму Гальпяровічу свой акраверш. Са словамі ўдзячнасці Навуму Якаўлевічу выступіла Марыя Караваева, дырэктар ЦБС, якая стала ініцыятарам сустрэчы.

Галіна СТАШКЕВІЧ,
кіраўнік літаратурна-музычнага аб'яднання «Крылы» Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы горада Наваполацка
Фота даслана аўтарам

Зямны рай — родны край!

Пад такой назвай у публічнай бібліятэцы № 1 імя Льва Талстога адбыўся творчы вечар старшыні сталічнага аддзялення СПБ Беларусі Міхася Пазнякова. З ім сустрэліся навучэнцы каледжа энергетыкі і каледжа сэрвісу і тэхналогій.

Да ўдзелу ў сваім вечары Міхась Паўлавіч запрасіў члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэсу, барда, педагога, рэжысёра і актрысу Таццяну Жылінскую. У яе выкананні прагучалі аўтарскія песні на словы Міхася Пазнякова, а таксама на словы вядомага ўкраінскага паэта Сяргея Дзюбы, кнігу вершаў якога ў свой час віноўнік творчай імпрэзы пераклаў на беларускую мову.

Міхась Пазнякоў, як заўсёды, палымяна, з асаблівай любоўю гаварыў пра родную Быхаўшчыну, вёсачку Забродзе, у якой нарадзіўся, пра маляўнічую беларускую прыроду, якая спрыяла абуджэнню яго паэтычнага таленту, пра цудоўную, міралюбную, стваральную Беларусь, якой прысвяціў нямала вершаў, эсэ, апавяданняў, нарысаў, пра сваіх бацькоў, з якіх пачалася, па яго меркаванні, любая Радзіма.

Цёплыя, шчырыя словы пра творцу сказалі калегі, члены СПБ Таццяна Жылінская, Тамара Кавальчук, Алена Харавец, а таксама педагог, літаратар, сцэнарыст і рэжысёр Мінскага гарадскога тэатра паэзіі Ганна Красоўская. Дарэчы, Міхась Паўлавіч — стваральнік і дырэктар гэтага тэатра, які працуе ўжо сем гадоў.

Павел КУЗЬМІЧ

праекты

Лабараторыя тэатра

Другі раз у рамках Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» пройдзе тэатральная лабараторыя. Арганізатары — Расійскі інстытут тэатральнага мастацтва (ГИТИС) сумесна з дырэкцыяй фестывалю і Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатрам імя Якуба Коласа. Лабараторыя адбудзецца на пляцоўках Коласаўскага тэатра з 10 да 17 ліпеня.

Артысты Коласаўскага тэатра, студэнты Вышэйшай школы сцэнічных мастацтваў (Масква, Расія), Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў і Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў разбяруць знакамітую трагедыю Уільяма Шэкспіра «Гамлет». Кіраваць творчым працэсам будзе прафесар Расійскага інстытута тэатральнага мастацтва, кандыдат мастацтвазнаўства, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі Аляксандр Бармак.

Майстар-класы з артыстамі і студэнтамі правядуць старшыя выкладчыкі Расійскага інстытута тэатральнага мастацтва Ларыса Кайдалава (сцэнічная мова) і Дзмітрый Іваноў (сцэнічны рух). Па выніках работы лабараторыі 17 ліпеня, а 12-й гадзіне, на камернай сцэне тэатра будзе арганізаваны паказ сцэн з п'есы «Гамлет». Уваход вольны. У гэты дзень у 18.00 на вялікай сцэне будзе прадстаўлены спектакль «Клапатун, ці Справа майстра баіцца» — музычны вадэвіль па аднайменнай п'есе Аляксандра Пісарава ў выкананні студэнтаў-артыстаў вучэбнага тэатра Расійскага інстытута тэатральнага мастацтва.

Летась такая лабараторыя прайшла ў межах фестывалю ўпершыню і мела пазітыўны водгук у гасцей і ўдзельнікаў. На працягу тыдня на майстар-класах займаліся каля 30 беларускіх і расійскіх студэнтаў тэатральных спецыяльнасцей і маладыя коласаўскія акцёры. Вынікам лабараторыі сталі тэатральныя эцюды па п'есе Антона Чэхава «Тры сястры».

Юрый ІВАНОЎСКІ,
літаратурны рэдактар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа

памяць

Ён слухаў неба і зямлю

24 чэрвеня ў Брылёўскай сельскай бібліятэцы-клубе Магілёўскага раёна прайшла літаратурная імпрэза «Слухаю неба і зямлю», прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння беларускага і расійскага паэта Ігара Шклярэўскага.

Прысутныя паслухалі аповед пра лёс паэта, чый жыццёвы шлях пачаўся ў Бялынічах, прайшоў праз Магілёў і Мінск да Масквы, дзе паэзія Шклярэўскага гарманічна ўплялася ў вялікую савецкую і расійскую літаратуру.

На падрыхтаванай кніжнай выстаўцы асаблівую ўвагу прыцягнуў першы паэтычны зборнік паэта «Я иду!» з дароўным надпісам магілёўскаму тэатральнаму рэжысёру Андрэю Раеўскаму.

Гучалі вершы паэта, а чытачка бібліятэкі Ала Яцкова агучыла свае беларускамоўныя пераклады твораў юбіляра. Пісьменнік Мікалай Яцкоў падзяліўся ўспамінамі пра дзень 14 жніўня 2022 года, калі, паводле завяшчання, прах Ігара Іванавіча прывезлі з Масквы ў Магілёў і пахавалі на Машакоўскіх могілках побач з магіламі бацькоў.

25 чэрвеня, у дзень юбілею, прадстаўнікі Брылёўскай бібліятэкі наведалі месца апошняга спачыну паэта і ўсклалі кветкі.

Юлія ЯЦКОВА

між іншым

Летні экскурс

У сталічнай бібліятэцы № 16 імя Францішка Багушэвіча адбылася сустрэча з дзіцячай пісьменніцай Інай Фраловай.

Іна Мікалаеўна зрабіла невялікі экскурс па старонках сваіх кніг і прапанавала паразважаць над пытаннем: чаму нельга крыўдзіць кніжкі — псаваць і вырываць старонкі, загінаць іх, маляваць і дамалёўваць ілюстрацыі? Маленькія слухачы ахвотна ўключыліся ў размову і падзяліліся гісторыямі беражлівых адносін да кнігі.

Пасля пісьменніца прапанавала самым цікаўным і кемлівым адгадаць загадкі. Пераможцы і тыя, хто актыўна прымаў удзел у размове, атрымалі сувеніры ад Выдавецкага дома «Звязда».

Ганна СТАРАДУБ

«ЛіМ»-люстэрка

Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы аб'явіў аб пачатку грамадскага абмеркавання твораў, адабраных для ўдзелу ў конкурсе на саісканне прэмій Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2023—2024 гады. Як інфармуе БелТА, з інфармацыяй аб творах і іх аўтарах можна пазнаёміцца ў раздзелах аб прэміі Саюзнай дзяржавы на інтэрнэт-рэсурсах Саюзнай дзяржавы і на сайце «Дома прэсы». Водгукі і рэцэнзіі на творы, а таксама меркаванні і прапановы можна накіроўваць па электроннай пошце: *mail@postkomsg.com* або на адрасы: у Расійскай Федэрацыі — Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы; у Рэспубліцы Беларусь — прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску. Грамадскае абмеркаванне працягнецца да 1 верасня. Пасля гэтага Экспертны савет збярэцца яшчэ раз, каб вызначыць шорт-ліст з трох прэтэндэнтаў. Канчатковае рашэнне аб прысуджэнні прэміі будзе прымацца Вышэйшым Дзяржсаветам Саюзнай дзяржавы.

Дні беларускага кіно праходзяць у Маскве, паведамляе БелТА. У праграме — прэм'ерны паказ мастацкай стужкі Аляксандра Яфрэмава «Ліст чакання», якая расказвае пра беларускіх урачоў; «Альпійская балада» і нядаўнія работы беларускіх кінематаграфістаў («Правілы геймера», «Сляды на вадзе», «Зоркі сёмага неба» і альманах «Вайна. Застацца чалавекам»). Паказы адбываюцца ў найлепшых маскоўскіх кінатэатрах. Уваход для гледачоў бясплатны па папярэдняй рэгістрацыі. Дні беларускага кіно арганізаваны кінастудыяй «Беларусьфільм» сумесна з кампаніяй «Роскино» пры падтрымцы Міністэрства культуры Расіі.

Галоўны балетмайстар Вялікага тэатра Беларусі Ігар Колб запрошаны тэлеканалам «Расія-Культура» ў каманду шоу «Вялікі балет», перадае агенцтва «Мінск-Навіны». «Вялікі балет» — адзін з самых папулярных праектаў расійскага тэлебачання. Здымкі новага сезона пройдуць у канцы ліпеня — пачатку жніўня, а сам сезон стартуе восенню. Ігар Колб будзе весці праграму разам са Святланай Захаравай, прымай маскоўскага Вялікага тэатра, народнай артысткай Расіі. У новым сезоне «Вялікага балета» ў гледачоў будзе магчымасць трымаць кулакі за артыстаў, якія прадстаўляць у гэтым праекце Вялікі тэатр Беларусі, — за Дзмітрыя Уксуснікава і Анастасію Валошку.

Расійскі Дзяржаўны літаратурны музей «XX стагоддзе» адкрые сёння новую пляцоўку ў Вялікім Гасціным двары ў Санкт-Пецярбургу. Цэнтральнай часткай экспазіцыі стане выстаўка «Лаўцы слоў», прысвечаная літаратурнаму жыццю Пецярбурга — Петраграда — Ленінграда першай трэці XX стагоддзя. «Мы не падмяняем іншыя літаратурныя музеі, паколькі кожны з іх унікальны, кожны расказвае пра свайго героя. І ўсе яны — мемарыяльныя, — расказала «ИТАР-ТАСС» дырэктар музея «XX стагоддзе» Марына Ліновіч. — Наш музей накіраваны на тое, каб у цэлым знаёміць з літаратурным працэсам XX стагоддзя. Ён вельмі шматслойны, што дасць адчуць і наша новая выстаўка». Матэрыяламі для пляцоўкі падзяліліся Расійская нацыянальная бібліятэка, Інстытут рускай літаратуры РАН, Цэнтральны дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў горада і інш. Таксама музей плануе прымаць выстаўкі з іншых гарадоў.

Новы поўнаметражны анімацыйны фільм японскага рэжысёра, заснавальніка студыі *Ghibli* Хаяа Міядзакі «*How do you live?*», які ў расійскай лакалізацыі вядомы пад назвай «Як маецеся?», выйдзе эксклюзіўна ў анлайн-кінатэатры «Кинопоиск» пасля заканчэння кінатэатральнага пракату. Як перадае «ИТАР-ТАСС», прэм'ера карціны ў Японіі адбудзецца 14 ліпеня, дату пракату ў іншых краінах аб'явяць пазней. Прадзюсар студыі *Ghibli* Тосіа Судзукі раней паведаміў, што фільм «Як маецеся?» стане для Хаяа Міядзакі апошнім.

Археолагі адшукалі страчаны горад мая на поўдні паўвострава Юкатан у Мексіцы, піша РІА «Новости». Яго назвалі «Акамтун» («каменная калона»). Каб дабрацца да яго, вучоныя прайшлі 60 кіламетраў па джунглях. Эксперты знайшлі розныя будынкі, у тым ліку некалькі пірамідальных канструкцый вышынёй 15 метраў. Частка збудаванняў разбураная. Аб горадзе даведаліся дзякуючы сучасным тэхналогіям. Перад тым, як адправіцца ў экспедыцыю, археолагі прасканавалі тэрыторыю пры дапамозе лідара. Гэта тэхналогія для вымярэння адлегласці, дзе выкарыстоўваецца адбітак лазерных прамянёў ад паверхні. Без яе пабудовы засталіся б схаваныя для чалавечага вока за дрэвамі.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

На кніжных

Якія сакрэты хаваюцца «На кніжных паліцах»? Якімі шчодрымі дарамі асыпаюць яны неўтаймоўных шукальнікаў ісціны? Толькі новыя пытанні, яшчэ большая прага да пошукаў і вечны душэўны неспакой — вось чым адорваюць кніжныя паліцы сваіх заўзятых прыхільнікаў. Чаму ж, нягледзячы на ўсё гэта, людзі ўпарта працягваюць пакланяцца кнізе, зноў і зноў звяртаючыся да яе? Адказ на паверхні: кніга — наш даўні сябар, наш пастаянны суразмоўца. Страціць яго — значыць страціць тое натхняльнае адчуванне адкрыцця, што прыносіць чытанне. Страціць кнігу — значыць страціць фантазію, а з ёй канчаткова забыцца на фарбы і смак. Словам, страціць кнігу — усё адно што страціць блізкага! Пазбегнуць гэткай нядолі чалавецтву на працягу стагоддзяў дапамагаюць адданыя рупліўцы. У розныя часы іх называлі па-рознаму: кніганошы, карабейнікі, кнігары. Сярод іх у асобную касту заўсёды вылучаліся букіністы — надзеленыя асаблівым статусам і дапушчаныя да сакральных крыніц «жрацы»…

Гартаючы час

Бадай, галоўнай букіністычнай пляцоўкай у краіне была і застаецца сталічная кнігарня «Вянок», што на ўскрайку Траецкага прадмесця. Па словах Уладзіміра Матусевіча, генеральнага дырэктара прадпрыемства «Белкніга», на балансе якога крама знаходзіцца з 2016 года, «кніга, старая кніга ўвасабляе сабой нейкія былыя часы, часы, калі стаўленне да друкаванага слова было больш узвышаным. Такія выданні перадаюць атмасферу мінулага, аўру аўтараў, чытачоў, якія калісьці імі валодалі, іх гарталі, захоўваюць цяпло рук і, што называецца, подых часу». Сакрэтамі пра тое, чым сёння жыве букіністыка і ўласна кнігарня «Вянок», з намі падзялілася загадчыца гэтай легендарнай крамы Наталля Чыжэўская.

— Ад якога моманту вядзе свой летапіс «Вянок»?

— Гісторыя кнігарні налічвае больш за сорак гадоў. Пачалося ўсё ў 1980-я. Тады, у рамках рэканструкцыі Траецкага прадмесця, гэты будыначак на набярэжнай атрымаў другое жыццё. Па задуме архітэктараў, якія кіравалі працэсам, тут павінна была размясціцца букіністычная крама пад назвай «Вянок» — у гонар адзінага прыжыццёвага зборніка Максіма Багдановіча (ён у гэтым квартале нарадзіўся). Уласна, крама была здадзена ў эксплуатацыю раней за афіцыйнае адкрыццё ўсяго адрэстаўрыраванага комплексу — у 1982 годзе.

На самым старце «Вянок» быў на сто працэнтаў букіністычным, працаваў толькі са старой кнігай, антыкварнымі выданнямі, паштоўкамі і пад. Пазней узніклі цяжкасці: ад першага паверха, дзе раней працавалі таваразнаўцы, змяшчаўся картатэчны пакой і прымалі кнігі ў насельніцтва, давялося адмовіцца, і з цягам часу крама перайшла на баланс Паліграфкамбіната. Значна пазней, у 2016 годзе, яна стала часткай «Белкнігі». Тут з'явіліся паліцы з новай літаратурай, але ў вельмі абмежаваных аб'ёмах. Асноўным напрамкам працы быў і застаецца гандаль старой кнігай.

— Чым адрозніваецца асартымент крамы «Вянок» ад асартыменту іншых падобных аб'ектаў на балансе «Белкнігі»?

— У Мінску на дадзены момант знаходзяцца тры букіністычныя крамы, якія належаць «Белкнізе»: «Вянок», «Букініст» на праспекце Незалежнасці і «Веды» на вуліцы Карла Маркса. Але ў адрозненне ад іншых дзвюх названых, якія яшчэ і паўнавартасна гандлююць новым таварам, мы прыярытэт аддаём менавіта букіністыцы. Акцэнт робіцца на рарытэтныя выданні гуманітарнага напрамку: краязнаўства, гісторыя, паштоўкі, якія ўяўляюць інтарэс для калекцыянераў, беларускамоўная літаратура і літаратура на замежных мовах.

Нешматлікія сучасныя выданні прадстаўлены літаратурай дзяржаўных выдавецтваў. У асартыменце, аднак, няма такіх катэгорый тавараў, як школьныя падручнікі, метадычныя матэрыялы… Каля 80 %, такім чынам, прыходзіцца на букіністычную кнігу, астатнія 20 % — дзяржвыдат.

— Якія яшчэ выданні, акрамя ўласна кніжных, можна знайсці на паліцах «Вянка»?

— На жаль, разбуральныя войны мінулага стагоддзя, якія пранесліся па тэрыторыі Мінска і Беларусі, знішчылі шмат каштоўных выданняў, чым вельмі ўскладнілі працу сучасных букіністаў. Сярод знішчанага ёсць, канешне, не толькі кнігі. Напрыклад, моцна пацярпелі картаграфічныя матэрыялы, таму даваенныя карты сёння — сапраўдная рэдкасць. Але затое картаграфія 1960—1970-х гадоў — цалкам існуючая з'ява. Даволі шмат карт прыносяць і нам.

Акрамя таго, нямала ў асартыменце старых паштовак. Так, ёсць у нас выдатная серыя паштовак рамантычнага напрамку недзе канца XIX стагоддзя — калекцыя прыгожых дзяўчын. Нярэдкія госці на нашых паліцах і сацрэалістычныя паштоўкі савецкага перыяду, канверты, знакі. Ёсць і фатаграфіі: фота з прыватных калекцый, партрэты розных знакамітых людзей, пейзажныя здымкі… Словам, шмат чаго цікавага можна знайсці.

— Як абыходзяцца з новапрыдбанымі кнігамі? У якім стане яны трапляюць у краму і ці праходзяць праз рэстаўрацыю?

— Вядома, бывае, што кніжка не ў вельмі добрым стане трапляе да нас, але — зраблю на гэтым асаблівы акцэнт — патэнцыяльны гаспадар заўсёды ведае лепш, як той ці іншы фаліянт павінен выглядаць. Таму ў нас катэгарычна забаронены скотч, клей і самавольная рэстаўрацыя. Некаторыя здаюць кнігі, ужо ўклаўшы грошы ў рэстаўрацыю, у вельмі прыгожым, адрамантаваным стане. Так што з кнігамі нічога не робім, бо, зноў жа, будучы гаспадар зробіць па-свойму і толькі ён ведае, наколькі той ці іншы карашок упішацца ў яго бібліятэку.

Мы ў сваю чаргу гарантуем захаванасць кнігі і беражлівае да яе стаўленне. У памяшканні падтрымліваецца тэмпературны рэжым. Што тычыцца зусім старых і крохкіх выданняў, якія ўяўляюць асаблівую гістарычную каштоўнасць, то такія мы бачым вельмі рэдка і найчасцей гэта музейныя экспанаты. Яны адпраўляюцца непасрэдна ў музей, дзе з імі працуюць інакш.

— Якімі кампетэнцыямі павінен валодаць букініст?

— Многія з тых, хто працуе ў букіністычных аддзелах і крамах, апантаныя сваёй працай, з радасцю размаўляюць з кнігалюбамі, ну і, трэба думаць, самі імі ж з'яўляюцца. Усё-такі прадаць кнігу не тое ж самае, што прадаць пачак пральнага парашку.

Здараецца, чалавеку падаецца, што кніга, якую ён прынёс, каштуе вялізных грошай. Наша задача тут — прымаючы пад увагу назапашаныя маніторынгавыя звесткі аб продажы і попыце на падобную літаратуру, паставіць здаровую цану. Перад гэтым важна праверыць інфармацыю аб тыражнасці, аб годзе выдання, аб тым, як кніга зберагласа з цягам гадоў… Безумоўна, кожнае выданне патрабуе індывідуальнага падыходу.

Наша праца вымагае адукацыі і пастаяннай самаадукацыі. Мы назіраем за актуальным рынкам, цікавімся кнігавыдавецкай справай XXI стагоддзя, сочым за кніжнымі і антыкварнымі аўкцыёнамі: што дзе прапаноўваецца (а раптам трапіцца на вочы ці ў рукі). Самаадукацыяй займаецца кожны букініст, бо гэта вельмі спецыфічны гандаль, у адрозненне ад гандлю новай кнігай. Новая кніга падпарадкоўваецца, так бы мовіць, законам моды: выйшаў, умоўна кажучы, «Гары Потэр», і ўсе кінуліся яго купляць. Букіністычная кніга — штосьці зусім іншае. Гэта вечны пошук нечага цікавага і незвычайнага…

— Вы ўзнялі цікавую тэму… Пэўна, існуе мода і ў букіністыцы?

— У нейкім сэнсе так, мода мае месца. Але ж гэта больш тычыцца маладых чытачоў. Скажам, нехта зацікавіўся Фрэйдам. Ён пачытаў, потым парэкамендаваў сябру, а той — свайму. Вось табе і попыт… Такое сапраўды існуе, але сярод сталага пакалення падобныя працэсы не назіраюцца. У гэтых колах, як правіла, пераважаюць людзі, кожны з якіх трымаецца свайго рэчышча: першы збірае тэматычную калекцыю, другі збірае кніжкі, праілюстраваныя канкрэтным мастаком, трэці — выключна дзіцячую літаратуру.

— І ўсе яны, відаць, часта наведваюцца ў краму… Ёсць любімыя заўсёднікі?

— Ведаеце, нашы пакупнікі — гэта наша сям'я. І яны, за выключэннем хіба што гасцей горада і краіны, практычна ўсе — заўсёднікі. (Дарэчы, турысты таксама завітваюць даволі часта.) Складана апісаць партрэт сярэдняга наведвальніка. Шмат творчай інтэлігенцыі: пісьменнікаў, мастакоў, журналістаў…

— Можаце прыгадаць якія-небудзь цікавыя гісторыі з вашай практыкі? Якімі шляхамі і што за кнігі траплялі ў краму?

— Нягледзячы на тое, што кніжнаму гандлю я прысвяціла 38 гадоў свайго жыцця, у букіністыцы працую ўсяго сем — з 2016-га… Быў такі выпадак, калі з асабістай бібліятэкі аднаго вядомага літаратуразнаўцы пасля яго смерці да нас трапіла прыжыццёвае выданне таго самага «Вянка» Максіма Багдановіча. Вельмі мала экзэмпляраў засталося на руках, і гэта стала для нас прыемнай нечаканасцю. Кнігу прапанавалі ў музей пісьменніка, і там з радасцю адгукнуліся. Такое задараецца даволі часта, калі нашчадкі знакамітых людзей распрадаюць кніжкі. Штосьці аддаюць у музеі, а штосьці трапляе на паліцы крамы.

— Якія самыя каштоўныя ці незвычайныя выданні можна знайсці ў «Вянку» цяпер?

— У нас шмат чаго ёсць. Напрыклад, асаблівай папулярнасцю карыстаюцца дзве буйнафарматныя кнігі на старасла-вянскай мове. Людзі часам просяць проста дакрануцца да іх, паглядзець. А гэта алтарныя кнігі, якія выкарыстоўваліся на царкоўных службах. Выглядаюць яны вельмі ўнушальна, таму заўсёды прыцягваюць увагу.

Цікава пакупнікам было глядзець і на 23-томную энцыклапедыю Южакова 1903 года. Прыгожае, кабінетнае, дыхтоўнае выданне. Ведаеце, чым прыгажэйшы карашок, тым большую цікавасць кніга выклікае!

Гутарыў Мікіта ШЧАРБАКОЎ
Фота Кастуся ДРОБАВА

Чытаем з «Белкнігай»

паліцах

БЕЛКНІГА

Нібы ў аптэцы!

Любы гандлёвы пункт, які знаходзіцца на балансе «Белкнігі», — няважна, крама гэта альбо кіёск, — мае сваё ўнікальнае аблічча, свой дух і сваіх заўсёдных пакупнікоў. Асабліва гэта датычыцца крам з гісторыяй. Адна з такіх — «Цэнтральная кнігарня» на праспекце Незалежнасці, 19 — яркім алмазам ззяе ў сэрцы сталіцы, не саступаючы іншым мінскім славутасцям, нанізаным на галоўную гарадскую магістраль. Цалкам адпавядаючы назве, гэтая кніжная крама займае цэнтральнае месца ў структуры гандлёвага прадпрыемства рэспубліканскага маштабу.

Галоўнымі «фішкамі» адной з самых старых мінскіх кнігарань з'яўляюцца найшырэйшы асартымент і скіраванасць менавіта на рознічны гандаль. Гэта значыць, што ў прыярытэт ставяцца патрэбы і фінансавае становішча кожнага патэнцыяльнага пакупніка. Калі чалавек пераступіў парог кнігарні, ён не павінен сыходзіць з пустымі рукамі. Незалежна ад густу, узросту ці таўшчыні кашалька чытач знойдзе тое, што шукаў, альбо, прынамсі, дастойную альтэрнатыву. На не самай вялікай плошчы ўмяшчаецца найвялікшы па колькасці найменняў асартымент сярод усіх кнігагандлёвых аб'ектаў у Беларусі. Супрацоўнікі трымаюцца наступнага крэда: «Мы "Цэнтральная" — значыць павінны мець усё і для ўсіх». Калі «Злачынства і пакаранне», то ў максімальна шырокім дыяпазоне — ад сямі рублёў для звычайных чытачоў да ста і тысячы — для прэміяльных. Таму кнігалюбы з усёй краіны і прыязджаюць сюды.

Зразумела, паліцы папаўняюцца не толькі за кошт айчыннай прадукцыі. Па словах загадчыцы філіяла Інгі Бекіш, у крамы ўсталяваліся блізкія партнёрскія сувязі з вядучымі расійскімі выдавецтвамі. Так, адным з дыпламатычных дасягненняў «Цэнтральнай кнігарні» з'яўляюцца прамыя пастаўкі кніг такіх буйных выдавецтваў, як «АСТ», «Эксмо», «Азбука» і «Махаон». Прычым па прыстойных цэнах, значна ніжэйшых за сярэднія на мясцовым рынку.

Падмурак, без якога немагчыма было б уявіць падобных поспехаў, — адданы калектыў. Тут працуюць самыя вопытныя кнігазнаўцы, якія добра ведаюць, што яны прадаюць. І найчасцей пакупнік прыходзіць менавіта да прадаўца па рэкамендацыю, а не па канкрэтнае выданне: кожнаму гарантуецца індывідуальны падыход. «Нібы ў аптэцы!» — кажуць супрацоўнікі. «Тут на адзін квадратны метр спецыялістаў, якія абслугоўваюць пакупніка, больш, чым дзе б тое ні было», — зазначае Інга Бекіш. Сярод тых, хто працуе ў краме, па меншай меры палова мае за плячыма больш за 20 гадоў прафесійнага стажу, а па эканамічных паказчыках кнігарня з адрывам пераганяе многія іншыя.

Генеральны дырэктар ААТ «Белкніга» Уладзімір Матусевіч:

— Старыя сцены памяшканняў, у якіх гадамі прадаваліся і набываліся кнігі, захоўваюць асаблівую энергетыку, ствараюць атмасферу. Мы стараемся ўлічваць такія моманты. Адна з самых старых і разам з тым найбуйнейшая ў нашай сетцы кніжная крама — гэта «Цэнтральная кнігарня» на праспекце Незалежнасці ў Мінску. Яна адкрылася ў 1952 годзе і з таго часу паспела стаць сапраўдным сімвалам сталіцы. Не меншае значэнне для гісторыі горада мае кнігарня «Веды» непадалёк ад Купалаўскага тэатра (раней яна называлася «Палітычная кніга»). Працягваюць гэты шэраг «Светач» на праспекце Пераможцаў і крама, якая цяпер называецца «Кнігі & Кніжачкі», а раней насіла назву «Падпісныя выданні». Тут жа назавём і «Вянок», што ў Траецкім прадмесці. Усе ці амаль усе пералічаныя аб'екты знаходзяцца ў будынках — помніках архітэктуры. Маюцца гістарычныя крамы і ў іншых гарадах. Напрыклад, «Слова» ў Барысаве (1952 года адкрыцця). Быццам бы звычайны будынак, але ж таксама ўжо з гісторыяй. Гэта і крама «Спадчына» ў Маладзечне, і шэраг гандлёвых пунктаў у Гомелі, якія размясціліся на вуліцы Савецкай і вакол яе. 2-гі, 3-ці, 9-ты «Букініст» вылучаюцца прыгожым унутраным убраннем, адмысловай энергетыкай. Нельга абмінуць увагай краму «Раніца» ў Гродне, ваўкавыскія «Кнігі» і «Школьнік». Словам, ёсць шмат такіх аб'ектаў, завітваючы куды пакупнікі, спадзяюся, адчуваюць атмасферу кніжнасці, далучэння да слова.

Як жангліраваць попытам?

Выпраўляўчыся ў вандроўку па найбольш знакавых і заўважных крамах «Белкнігі», нельга абмінуць увагай адну — вельмі «іскрыстую»… Па значнасці і фінансавых параметрах Дом кнігі «Светач» не адстае ад «Цэнтральнай кнігарні», а па асобных паказчыках нават і пераганяе свайго пабраціма. Паглядзім жа, чым здзіўляе наведвальнікаў легендарная сталічная крама, якая летась адзначыла 45-гадовы юбілей.

На фоне іншых кнігагандлёвых пунктаў «Светач» вылучаецца ў першую чаргу сваімі памерамі. Вялізныя плошчы (без малога 2000 квадратных метраў і 2 паверхі) дазваляюць размясціць у залах максімальна шырокі асартымент, які не на шмат саступае па маштабах «Цэнтральнай кнігарні».

Усё гэта ў пэўнай ступені адбіваецца на выкладцы: кнігі можна адразу вялікай колькасцю выстаўляць на невысокія прылаўкі, каб гэта было заўважна і прыгожа глядзелася. Да таго ж многія з іх павернуты вокладкай да пакупніка, што дазваляе ствараць акцэнты і віртуозна жангліраваць попытам. Паводле назіранняў супрацоўнікаў, калі кніга стаіць «тварам» і на ўзроўні вачэй, продаж ідзе непараўнальна актыўней: «Чалавек адразу можа ўбачыць выданне. Вось ён прыходзіць, і адразу погляд падае на яркую прыгожую вокладку».

Адзін з самых папулярных аддзелаў, як сцвярджаюць супрацоўнікі, — беларускай літаратуры. У ім прадстаўлены кнігі дзяржаўных выдавецтваў: напрыклад, дакументальна-публіцыстычныя творы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, гісторыка-геаграфічныя альбомы, у вялікай колькасці — альбомы беларускіх мастакоў… Багаты выбар мастацкай літаратуры, першынства ў якой — за класікай (у модзе зноў Уладзімір Караткевіч, Янка Купала, Якуб Колас). Шмат у аддзеле таксама дзіцячай літаратуры.

Ва ўсёй гэтай разнастайнасці дапамагае арыентавацца адмысловая навігацыйная сістэма і інфакіёскі, размешчаныя на абодвух паверхах. Кожны пакупнік пры жаданні можа праверыць наяўнасць той ці іншай кнігі: альбо па імені аўтара, альбо па назве. Асабліва часта паслугай карыстаюцца турысты, якіх шмат сярод штодзённых наведвальнікаў кнігарні. І яны шукаюць не толькі літаратуру на замежных мовах. Спецыяльна для гасцей горада ў краме былі адкрыты вітрыны з сувенірнай прадукцыяй, такой у залах шмат.

Важным аспектам дзейнасці Дома кнігі «Светач» з'яўляецца прасоўванне кнігі і чытання. Так, у краме рэгулярна праводзяцца кніжныя прэзентацыі з удзелам аўтараў. Студэнты, людзі, апантаныя літаратурай, знакамітыя асобы дый проста цікаўныя завітваюць на імпрэзы ў «Светачы». Абсталяваная ўсім неабходным для падобных мерапрыемстваў (экранам з праектарам, гукавой сістэмай, мікрафонамі) прэзентацыйная пляцоўка размяшчаецца на другім паверсе. Тут жа знайшла прытулак і «Літаратурная кавярня» — адзіны ў сваім родзе гандлёвы пункт на балансе «Белкнігі» са смачнай кавай.

Веды чэрпаюць у «Ведах»

Адным з важных адрасоў на карце сеткі «Белкніга» з'яўляецца і сталічны Дом кнігі «Веды», што на вуліцы Карла Маркса. Крама была адкрыта ў 1968 годзе і першапачаткова насіла назву «Палітычная кніга». У 1996-м у кнігарні з'явіўся букіністычны аддзел, які з цягам часу стаў сімвалам крамы і сёння складае даволі важкую долю ад усяго яе тавараабароту. Гістарычна акцэнт у выкладцы рабіўся менавіта на грамадска-палітычную і юрыдычную літаратуру. Разбяромся ж, творы якога напрамку пераважаюць на кніжных паліцах «Ведаў» сёння.

Натуральна, за апошнія гады асартымент моцна змяніўся, і са спецыялізаванай крама ператварылася ў паўнавартасную кнігарню з шырокім выбарам кніг. Зрэшты, калі прыгледзецца, можна ўсё ж заўважыць у ім перавагу пэўных катэгорый тавараў. І, хоць на паліцах у прыкладна роўных прапорцыях прадстаўлены ўсе віды выданняў (ад вучэбна-метадычнай літаратуры да мастацкай), тэматычны ўхіл у бок эканомікі і права адчувальны. Тым не менш, як запэўніваюць супрацоўнікі, любым выданням знойдзецца месца ў краме.

Акрамя таго, Дом кнігі «Веды» з'яўляецца «апорным пунктам» дзяржаўнага Выдавецкага дома «Беларуская навука». Вялікі стэнд цалкам запоўнены кнігамі выдавецтва — у асноўным гэта навуковая, энцыклапедычная і тэхнічная літаратура. Асобнай вітрынай прадстаўлена сувенірная прадукцыя аб'яднання «Белмастпромыслаў»: паштоўкі, цацкі, дэкаратыўны посуд…

Побач з аддзелам новай кнігі вось ужо не першае дзесяцігоддзе працуе букіністычны аддзел. «У нас, атрымліваецца, дзве крамы. Як кажуць, дзяржава ў дзяржаве», — адзначаюць у кнігарні. Старых кніг па-сапраўднаму шмат: тут вам і мовазнаўства, і псіхалогія, і кулінарыя, і мастацкая літаратура, і, само сабой, рарытэтныя фаліянты, якія трапляюцца нячаста… Іншымі словамі, букіністыка — гэта не проста нейкі дадатак. Тут сфарміраваўся ўжо свой попыт, свая аўдыторыя. Многія з пакупнікоў завітваюць у краму амаль кожны дзень.

Каміла НАВІНКІНА
Фота Кастуся ДРОБАВА

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

Лета з «Нёманам»

«Гасподзь, даруй мне доўгае лета і прыгожае імя», — так гучаць радкі з вершаванай малітвы адной кітайскай паэтэсы. Шосты нумар часопіса «Нёман» цалкам адпавядае чаканням чытача ў гэтае цудоўнае лета, адчыняючы дзверы ў вытанчаны свет яснага слова і сонечных імёнаў.



Так, традыцыйную рубрыку «Паэзія і проза» адкрывае падборка вершаў чалавека, імем якога названа зорка. Уяўляеце, які доўгі шлях даводзіцца прайсці, каб у гонар цябе назвалі нябеснае цела! Паэт Анатоль Аўруцін святкуе юбілей — 75 зямных гадоў і 25 зборнікаў паэзіі.

Паэзія А. Аўруціна гуманістычная, праўдзівая, без вынаходстваў і мудрагелістых метафар. Яна аб галоўным: аб жыццёвым шляху, які праходзіць чалавек. На гэтым шляху ён філасофствуе, любіць, верыць, спадзяецца. У прадстаўленых вершах гучыць матыў памяці, які рэалізоўваецца на аснове вобразаў завеі, што замятае сляды мінулага, храма, дарога ў які пракладзена выпрабаваннямі і пакутамі. Лірычны герой Аўруціна застаецца дзіцём у душы, адпавядаючы евангельскаму закліку «будзьце як дзеці».

І, вядома, асноўнай у лірыцы з'яўляецца тэма кахання. Даследчык У. Тапароў пісаў аб памяці прадметаў, аб духоўным змесце кожнай рэчы, якая становіцца нейкім знакам, сімвалам для чалавека, што складае цуд яго быцця. Такім сакральным прадметам у вершы А. Аўруціна становіцца… коржык! Па-

И мы бредем. По сумеркам, вдвоем —
С тобой в безлюдье нет, не одиноко.
С трудом себя в витринах узнаем —
Так неохота стариться до срока.

І ў пастаянным імкненні праявіць клопат аб каханай герой пытаецца: «Чаго б хацелася табе, мілая мая?» А ў адказ чуе:

Купи мне коржик… В школьную пору
Он был моей живительной усладой.
Казалось, что без коржика умру…
Припомнилось… Пошли, меня порадуй…

Ён купляе ёй коржык, які становіцца правадніком у дзяцінства і элексірам маладосці, а затым і неўміручасці. Гераіня пяшчотна адкусвае кавалачак за кавалачкам і зменьваецца, ператвараючыся ў юную летуценніцу, гарэзлівую і далікатную. Коржык, набыты з любоўю, — як благаслаўленне на вечнае каханне, мацнейшае за смерць.

Тэма кахання ў розных яе праявах працягваецца ў цыкле апавяданняў Валянціны Кадзетавай «Усё роўна будзе лета». Падобныя тэксты пасля Пялевіна, яго «Блакітнага сала» і іншай чарнухі постмадэрнісцкай літаратуры чытаюцца на адным дыханні і ўспрымаюцца нібы глыток свежага паветра ў інтэлектуальнай каламуці сучаснай кніжнай культуры. Творы напісаны ў рэчышчы сучаснага кірунку ў літаратуры — новага рэалізму (маніфестам якога стала эсэ С. Шаргунова «Адмаўленне жалобы»). Новы рэалізм прапануе вярнуцца да традыцыйных тэм і герояў літаратуры, да чэхаўскага закліку «пісаць проста, як Марыя Іванаўна гарбату п'е». Да выявы чалавека звычайнага, маленькага, дзе «глеба — рэальнасць, карані — людзі», сцвярджаючы формулу: «рэалізм — ружа ў садзе мастацтва». Такія персанажы апавяданняў В. Кадзетавай «Крыўда», «Валечка», «І гэта яшчэ не ўсё!», «Я ёй не дарую» і інш.

На старонках твораў — тыповыя прадстаўнікі розных сацыяльных пластоў: прыезджыя, студэнты, алкаголікі, закаханыя і разведзеныя. Кожнае апавяданне — ілюстрацыя жыцця. Але тэксты маюць галоўнае — эйдас, ідэйна-мастацкі базіс, які выяўляецца сімволікай, складанай вобразнай сістэмай, жылая пара гуляе па вячэрнім горадзе:

тымі «ўніверсальнымі супольнасцямі», якія вялікі філосаф А. Лосеў называў міфамі. Яркая ілюстрацыя таму — апавяданне «Сёмая палата», у назве якога хаваецца алюзія на «Палату № 6» А. П. Чэхава.

У сёмай палаце сярод жанчын-пацыентак панавалі мір і ўзаемная сімпатыя. Сярод жанчын асабліва вылучаецца Тамара — складаная, летуценная, супярэчлівая натура. *«Тома, ты похожа на молодую Ахматову (…) странная ты, Тамара, не от мира сего. Хитрости в тебе ни на грош (…) трудно тебе в жизни будет»,* — гучыць як здзейсненыя праροцтвы ў лёсе рускай паэткі. Інтэртэкстуальнасць як катэгорыя сучаснай літаратуры тут ставіць сваёй мэтай не «пагуляць» з класічнымі тэкстамі і вялікімі імёнамі, накшталт пялевінскага каўбоя-Талстога, а актуалізаваць характар гераіні пры дапамозе параўнання яе са шматпакутнай і адкрытай усім жыццёвым нягодам душы вялікай рускай паэтэсы.

Тамара расказвае пра сваё сямейнае жыццё, якое не склалася: *«Прожила я с ним два года, словно на холодном ветру простояла, даже слова доброго не услышала».*

Стаянне на халодным ветры становіцца парафразам ахматаўскага верша «Сціснула рукі пад цёмным вэлюмам»:

Задыхаясь, я крикнула: «Шутка
Все, что было. Уйдешь, я умру».
Улыбнулся спокойно и жутко
И сказал мне: «Не стой на ветру».

Новы герой Тамарынага рамана — пацыент Віктар, амаль аслеплы, які прыкідваецца «маёрам з гарачай кропкі Сірыі», чытае ёй, а пасля яе выпіскі і іншым жанчынам адны і тыя ж вершы. У кожнай ён шукае разуменне і бачыць патэнцыяльную спадарожніцу жыцця. На папрокі Тамарынай сяброўкі, якая выкрывае няўдачлівага донжуана, «маёр» апраўдваецца: *«Я ждал (любви). Сейчас уже не жду. Давным-давно. А эти флиртики — всё, что у меня осталось. Иллюзия. Суррогат личной жизни».*

Фінал апавядання жыццесцвярджальны: Тамара сустрэла Віктара пасля бальніцы і не адмовілася звязаць свой лёс з інвалідам па зроку.

У наступным аповедзе Валянціны Кадзетавай «Гараджанка і лесавік» лейтматывам з'яўляецца вяртанне. Галоўныя героі — Ён і Яна. Быццам Адам і Ева, якія рассталіся аднойчы, пакінуўшы эдэмскі сад. Дакладней, пакінула яна. А ён застаўся, каб захоўваць і берагчы тое, што яму наканавана. Лес як рай — адна з сімвалічных трактовак садова-паркавай культурнай парадыгмы. Учарашнюю гараджанку, якая вярнулася ў лес, ногі вядуць не на запаветную палянку, дзе мілавалася з каханым, а да дрэва, паваленага ветрам. Гнілое дрэва як прыкмета страчанага раю — знак хваробы, смяротнасці. Блуканне ў лесе з'яўляецца прыкметай казачнага міфалагічнага хранатопу, дзе лес становіцца зачараваным міфічнымі істотамі месцам, і гераіня ўспамінае аб лесавіку. Вымаўляючы замову, яна пытаецца ў лесавіка, ці водзіць ён яе. І чуе голас: «Вяду!»

Перад ёй з'яўляецца мужчына з праніза зялёнымі вачыма. Зялёныя вочы у міфапаэтычнай традыцыі маюць вадзянікі або русалкі. На роспыты дзяўчыны, як герой «стаў лесавіком», ён тлумачыць: *«Нет, таким он не родился, таким стал только тогда, когда познал всю глубину человеческой подлости. С тех пор и не любит он людей, а особенно тех, кто осенью приходят, а чаще приезжают в его лес…».* Забруджаны лес, па якім бегаюць і гігікаюць людзі, сімвалізуе пекла бездухоўнай цывілізацыі, апаганены рай. Але герой цвёрды ў сваім намеры аднавіць ранейшае хараство. Ён жыве ў пабудаванай сваімі рукамі хаце каля ляснога возера. Аўтар паказвае, як абодва героі паступова знаходзяць рай пасля сустрэчы.

Філасофскую накіраванасць мастацкага свету Валянціны Кадзетавай падхоплівае лірыка Валерыя Грышкаўца, прадстаўленая ў падборцы вершаў «І хочацца жыць». Анталагічныя праблемы быцця, экзістэнцыяльныя пытанні дыялектыкі душы, этапы станаўлення чалавека надаюць вершам глыбокі псіхалагізм, адлюстроўваюць перажыты досвед і мудрасць, назапашаную з гадамі. Ад вершаў вее светлым смуткам з-за немагчымасці вярнуцца ў мінулае:

Скоро семьдесят.
Когда невыносимо тяжко,
Вспоминается улица,
Которой давно уже нет,
Лето, раскрытые окна…
И песни,
Забытые песни
Снова струятся из сердца,
И на душе
Легко и печально,
Как тогда,
В пятнадцать лет…

Але жыццё працягваецца — і ў летнія дні скрозь адчыненыя вокны і ласкавае калыханне фіранак чуюцца далікатныя словы маладой матулі. Лірычная гераіня ў малітоўнай падзяцы звяртаецца да нябёсаў:

Хочется кричать, смеяться, плакать.
Вот такой букет эмоций странный.
Потому что сердце стало капать
Сладкою, густой любовью мамы.

(«Мама»)

Гарачая ружа пустыні, птушка-фенікс, празрысты матылёк, загадкавая пальма Юка… Дзяўчынка ў чырвоным стала мамай, творчай асобай. Так у гарызонты свайго мастацкага свету прапануе адправіцца чытачам паэтка з Гродна Кацярына Каламійцава-Ігнацюк.

Аповесць Веранікі Ляўчук «Мой горад Сонца» прыйдзецца даспадобы не толькі падлеткам. Тут і перажыванні маладой дзяўчыны, якая марыць стаць пісьменніцай, і яе перапіска з творчымі сябрамі, і рэакцыя на дарослых (бацькоў, бабулю і дзядулю, з якімі адпраўляецца ў Еўпаторыю), і складаныя ўзаемаадносіны з традыцыйнай культурай, верай, гістарычным мінулым (паездкі ў Тураў да крыжоў, што растуць, у Магілёў, дзе ад радавога гнязда дзядулі засталася пустка) — і над усім гэтым гучыць як заклён такое простае, але важнае крэда моладзі:

«Я хотела жить. И мне казалось, что жизнь — это музыка, посиделки, путешествия».

Аповесць можа быць карысная і дарослым, якія захочуць лепш зразумець псіхалогію сваіх дзяцей і актуалізаваць увагу на найважнейшым — здольнасці своечасова сказаць: «Ляці!» Не зламаць, не падрэзаць крылы.

У паднябессе ў пошуках Вялікага Фільтра ўзіраецца герой, мудры старац з апавядання Анатоля Андрэева *«AD ASTRA»* Рыгор Міхайлавіч Гара. Падобна маркесаўскім персанажам і біблейскім патрыярхам, яму адкрыты таямніцы светабудовы. Магутны духам Атлант, ён не згінаецца пасля смерці адзінай дачкі, імя якой даў зорцы ў сузор'і Дзевы. Яго місія па збіранні Сусвету не заканчваецца. Разам са спадарожніцай Стэлай яны ствараюць новае жыццё, спрабуючы перамагчы смерць і прабіць глухую сцяну светаў. Феномен твора *«AD ASTRA»* ў малой форме, якая па змесце не саступае філасофска-метафізічнаму трактату з элементамі навуковай фантастыкі.

Другое апавяданне А. Андрэева «Хуткая фаза сну» ўяўляе сабой сінтэз паэтыкі сюррэалізму і экзістэнцыялізму. Сон як мастацкі прыём завуаляванай фантастыкі рассоўвае гарызонты псіхікі героя, яго адносін да свету, жонкі і самога сябе.

Узнімаецца тэма творцы і твора як мастацкага свету, раўназначнага свету Божаму. Цікавы матыў дваістасці: герой вядзе машыну і адначасова стаіць на пешаходным пераходзе. Сюжэт пабудаваны вакол пытання: прадаваць ці не прадаваць машыну? Але яно перарастае ў анталагічнае: быць ці не быць? Герой гіне — жонка прадае машыну, каб аплаціць пахаванне. Фінал, варты Кафкі.

У рубрыцы «Дакументы. Запіскі. Успаміны» змешчаны вытрымкі з дзённіка ваеннага часу «Дзень за днём» Мікалая Красоўскага.

Рубрыка «Другое дыханне» прадстаўлена інтэрв'ю з рэжысёрам, акцёрам, кампазітарам, музыкантам, стваральнікам музычных груп, фалькларыстам, пісьменнікам, мастаком, старшым выкладчыкам кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Іванам Кірчуком. З ім пра рэканструкцыі абрадаў і свят старажытнай Беларусі, стварэнне фальклорных ансамбляў і этнаграфічнага музея, напісанне кніг «Аўтабаны і менестрэлі» і «Гарыць свечка ў алтара…», крыніцы натхнення ў гісторыі культуры, клічы продкаў, калектыўнае несвядомае народнай творчасці, душы дубоў і музычных інструментаў, веру і інтуіцыю пагутарыла Надзея Цыркун.

Рубрыка «Эпоха» адкрываецца нарысам Леаніда Марозіка і Уладзіміра Сцяпанава «Справа была на Чэрвеньшчыне», прысвечаным гераічнаму і трагічнаму лёсу іх цёткі Кацярыны Марозік і яе брата Мікалая, якія былі расстраляны ў гады Вялікай Айчыннай вайны за сувязь з партызанамі.

У нарысе «Тры гады ў лесе» Таццяна Дашкевіч расказвае пра Раісу Фамінічну Філіповіч (у дзявоцтве — Тамашэўская), якая, будучы дзіцём, стала сувязной партызанскага атрада. Тры гады жыхары вёскі Кузевічы Лагойскага раёна хаваліся ў балотах ад немцаў. Аб страшных выпрабаваннях — голадзе, холадзе, хваробах, смерцях — апавядаецца ў нарысе, заснаваным на ўспамінах Раісы Фамінічны. Сімвалам перамогі жыцця ў нарысе сталі буслы — анёлы Белай Русі, якія вярнуліся на папялішча пасляваеннай вёскі.

Жыццё працягваецца, і праявай яго становіцца, у тым ліку, культурнае сяброўства паміж народамі. Пра гэта сведчыць артыкул Алеся Карлюкевіча «Морыс Сімашка: другое жыццё Усходу», прысвечаны літаратурнай садружнасці Беларусі і Казахстана. У ім старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі расказвае пра свае ўражанні ад творчасці народнага пісьменніка Казахстана Морыса Сімашкі і Міжнародных літаратурных чытанняў, удзельнікам якіх ён стаў. Па матэрыялах гэтых чытанняў у Алматы ў 2021 і 2022 гадах выйшлі два зборнікі, на старонках якіх прагучала беларуская тэматыка ў яе розных культурна-гістарычных аспектах.

Таццяна ЦЕЛЯХОВІЧ-СІДАРАВА

Без рыбалкі і рамантыка не рамантыка

Выпадак не часты. Толькі ўзяўся чытаць кнігу Алега Іванова «О романтике, рыбалке, людях и нравах», выпушчаную Выдавецкім домам «Звязда», як успомніліся яшчэ тры. Алег Мікалаевіч адну з іх і сам прыгадаў у самым пачатку свайго аповеду: «І полымя вогнішча, і вада, якая цячэ, заварожваюць, гэта ўсе ведаюць. Але на агонь трэба абавязкова глядзець, а што тычыцца вады — дастаткова адчуваць яе побач, чуць. Па сведчанні У. Арсеньева, Дзярсу Узала "разумеў, аб чым мармыча ручай"».



Алег Іваноў мае на ўвазе рускага пісьменніка і вучонага Уладзіміра Арсеньева, аўтара кніг «Дерсу Узала. Из воспоминаний о путешествии по Усурийскому краю в 1907 году», «По Усурийскому краю» и «В горах Сихотэ-Алиня», які падарожнічаў з нанайцам. Мне ж адразу прыгадаўся яшчэ адзін праваднік — эвенк Улукіткан. Той, з якім пакараў таежныя нетры яшчэ адзін рускі вучоны і пісьменнік — Рыгор Федасееў, таксама аўтар некалькіх кніг. Сярод іх і «Последний костёр» аб апошніх днях гэтага адважнага чалавека, які замерз у тайзе.

Трэцяя кніга — «свая», беларуская. Мяркую, што многія здагадаюцца, якая. Па жанры — «рыбацкая паэма», «Вандроўнае шчасце» называецца. Чытаць у ёй пра ўлюбёнасць Кастуся Кірэенкі ў родную прыроду, пра яго ні з чым не параўнальнае шчасце рыбака — адна асалода. Толькі некалькі вытрымак: «Калі ж гэта пачалося? З якой хвіліны вядзе сваю сцежку зачараванасць красою бацькоўскага краю, смутак па мясцінах непаўторных і незабыўных, дзе пляскотныя хвалі, бы казачныя самацветы, сыплюцца, наплываюць на пахкі аер, дзе серабрыстая плотка весела падміргвае вокам, быццам мае сказаць табе нешта дужа таемнае і святое?»

Працяг: «З якой хвіліны прыйшла ў душу неўтаймаваная асцярога — каб ніколі не страціць гэтае шчодрасці зямлі, гэтага бясконцага хараства?

З якой хвіліны прыйшло ў душу адчуванне, што ты — жывая часцінка сваіх светлых рачных абшараў, сваіх сонечных і грымотных небасхілаў, сваіх патаемных сцяжыначак-пуцявінак да самага шчаслівага берага?»

Згадаўшы ўсё гэта, споведзь Алега Іванова пачынаеш чытаць яшчэ з большым хваляваннем і спадзяваннем. Чаму з хваляваннем, шмат казаць не трэба. Спавядаецца не які-небудзь рыбак-пачатковец, а чалавек бывалы. Той, які аб'ездзіў, прабачце, абплаваў уздоўж і ўпоперак усю Беларусь. Яшчэ тады, калі яна была Беларусіяй. Адпаведна ў сваім аповедзе і прытрымліваецца гэтых дзвюх назваў. Колішняй і цяперашняй, калі стала суверэннай Беларуссю. Пабываў і ў многіх краінах, а там без рыбалкі — тое ж самае, што, наведаўшыся ў краі далёкія, застацца абыякавым да знакамітых мясцін. А спадзяванне пры чытанні вынікае з хвалявання. Так адбываецца тады, калі сутыкаешся з новым для цябе. З чалавекам, які аддаў так шмат гадоў свайму любімаму занятку. У дадзеным выпадку гэта ўсё тое, што звязана як з самой рыбалкай, так і з выпадкамі, датычнымі да яе.

Сёй-той, прачытаўшы гэта, усміхнецца: «Паслухаеш рыбака — ён такое табе выдасць, што хочаш смейся, а хочаш ад смеху слязамі залівайся». Калі ж засумняваешся ў праўдзівасці пачутага, пачне сцвярджаць, што самае неверагоднае не з ім самім было, а з некім іншым, але гэтаму ўсё адно нельга не верыць. Бо кожны сапраўдны рыбак не хлусіў, не хлусіць і хлусіць не збіраецца.

Усё гэтае «самае-самае» ў кнізе ёсць. Як кажуць, якая прафесія… Дакладней, якое захапленне — такія і норавы. Невыпадкова слова «норавы» нават у назву вынесена. Аднак усё гэта не прывабнага. Хоць гледзячы з якога боку да ўсяго падысці.

Алег Іваноў успамінае, як рыбаліў на Жэнеўскім возеры рэчкі Версуа. Тамашні рыбак здзівіўся, убачыўшы злоўленага ляшча. Высветлілася, што яго не бяруць у ежу з-за таго, што ў 20-я гады мінулага стагоддзя ён быў пагалоўна заражаны нейкай хваробай. Яе даўно няма, а на ўсялякі выпадак… У Злучаных Штатах Амерыкі, наадварот, вялікае здзіўленне ў паліцыі выклікаў вялікі ўлоў селядца.

Ёсць у кнізе, вядома, гісторыі не толькі гэтыя. Іншыя таксама ёсць. Яшчэ і тое, што ва ўсёй паўнаце зможа адчуць толькі сапраўды рыбак, да якіх, несумненна, адносіцца і Алег Іваноў. Ён мае права выказаць меркаванне, якім заканчваецца адзін з раздзелаў: «Да вядомай сентэнцыі "Кожны выбірае па сабе жанчыну, рэлігію, дарогу" дадам "і рабалку"». Іначай і быць не можа, бо даўно засвоіў для сябе важную ісціну: «Жыццё бывае вельмі розным, адной меркай не змераеш, паўсюль можна знайсці свой пазітыў. Яго і трэба шукаць. Негатыў, як і страты, самі цябе знойдуць. Але мы, рамантыкі і аптымісты, глядзім наперад з добрым настроем. Прадчуваем туманныя досвіткі, як бярэцца рыба мары, новыя ўражанні ад усяго, што нам люба і дорага».

Такім абзацам кніга і заканчваецца. Дзеля гэтага яна і пісалася. Застаючыся па-ранейшаму рамантыкам, нягледзячы на пражытыя гады, Алег Іванавіч пастараўся зрабіць усё для таго, каб нават той, хто на пройдзеных дарогах у многім растраціў гэтыя якасці, зразумеў: без рамантыкі — і жыццё не жыццё.

Сняжана РУДЗІК

Шанц на неверагоднае

Пад вокладкай кнігі Станіслава Валодзькі «Чароўныя чаравічкі», што нядаўна пабачыла свет, сабраны гісторыі для дзяцей. Жанр вызначаны аўтарам як «казачныя апавяданні». Так, назвы многіх з іх («Чарадзей-жартаўнік», «Чароўнае пёрка», «Цудадзейны покліч», «Дачка лесніка», «Добры мужык», «Яблычнае зярнятка», «Бадлівы Жук», «Як Зіма з Вясной спрачаліся»), дый загаловак апавядання, па якім названа кніга, нібы гарантуюць, што чытача чакае сустрэча з казкай. А, між тым, ледзь не ў кожнай з гісторый аўтар робіць арыгінальны своеасаблівы ход: пачынае яе па ўсіх канонах казачнага жанру, а калі надыходзіць час для кульмінацыі і развязкі, то — непрадказальнае па — і ты ўжо зусім у іншай плоскасці!.. Кожнага разу нельга спрагназаваць, што будзе ў фінале, і ў гэтым асноўная адметнасць ад чытання апавяданняў.

Да прыкладу, «Чароўныя чаравічкі»: «Адзін сялянскі сын, якога звалі Сымонам, статны хлопец, надта ўжо ахвочы быў да танцаў: не прапускаў ніводнай вечарынкі, а там не прастойваў ніводнага танца… А танцаваў — любата, не было яму роўных». Па законе казкі цалкам лагічна тое, што адбываецца далей: «Аднойчы на вечарынцы ўбачыў Сымон Ганну (з далёкага сяла да цёткі ў госці прыехала), і сэрца яго ў грудзях заскакала. Запрасіў прыгажуню на танец, і тая яму не адмовіла. Ганначка таксама такой танцоркай аказалася — вачэй не адвесці…

І неўзабаве па ўсім было бачна: справа ў іх да вяселля ішла прытанцоўваючы».

Што павінна адбывацца ў сапраўднай казцы, калі «прынц» (а хай сабе і сялянскі сын, галоўнае — годны) сустракае дзяўчыну і паміж імі імгненна ўспыхвае каханне альбо жарсць (а на гэтым этапе розніцы яны пакуль не разумеюць, дый яна неістотная)? Натуральна ж, злыя сілы ў выглядзе неўзаемна закаханых у «прынца» ці яго абраную, і тым самым непамерна пакрыўджаных, «трэціх лішніх» альбо іх памагатых, разладжваюць ідылію «салодкай парачкі». Аўтар выяўляе класічную паслядоўнасць: «Але тут старасціха, хітрая баба, расхваліла Ганну заможным суседзям і з іх сынам да яе самога старасту паслала сватам. А ўсё з-за таго, што на старасціхіну дачку Сымон мала звяртаў увагі, хоць тая, як зачараваная, даўно па хлопцу млела. Вельмі ўжо Ганулька шанавала сваіх бацькоў і не паслухаць іх не змагла…»

Для класічнага казачнага сюжэта гэта распаўсюджаная завязка. Далей, захоўваючы вернасць пачуццям, героі, прайшоўшы праз шматлікія выпрабаванні, у рэшце рэшт павінны былі б з'яднацца, узяць шлюб, жыць доўга і шчасліва, дзелячы адно з адным усе радасці і нягоды, і памерці ў адзін дзень. Але не ў выпадку «Чароўных чаравічак» — хоць «сэрцу не загадаеш», Сымон яго ўгаварыў пагадзіцца на варыянт старасціхінай дачкі. Галоўным аргументам было тое, што дзяўчына закахалася ў яго «па вушы». Каб падмацаваць эфект, стараста вырашыў звярнуцца да чараўніка па любоўнае зелле. Але трапіў да «белага» мага, і той, замест зелля, загаварыў чаравічкі. Яны і паставілі кропку ў сумненнях хлопца: «У хуткім часе яна (г. зн. дачка

старасты. — **Заўв. рэд.**) у іх скакала на народным гулянні так, што і Ганна магла б пазайздросціць! І сэрца Сымона на здзіўленне стала згодлівым! Здараецца ў жыцці і так: пахмурнай парою не ліпла смалою, і стала жывіцай — не грэх і жаніцца…» Аўтарская філасофія сапраўды блізкая да жыцця, з гісторыі літаратуры вядома процьма падобных выпадкаў…

Адметныя апавяданні Станіслава Валодзькі яшчэ і тым, што ў іх адсутнічаюць героі, якія з'яўляліся б яркім увасабленнем зла, а тыя, што ўсё ж робяць нешта злое, неяк самі сабой перавыхоўваюцца, разумнеюць і мудрэюць, пераходзяць на бок дабра. Аўтар быццам аберагае мяккую датклівую дзіцячую псіхіку. Так у аповедзе пра дачку лесніка, дзе галоўная гераіня — сіротка Кацечка. І тут таксама класічны казачны зачын: злая мачаха прымушае падчарку рабіць самую чорную работу, адпраўляе па журавіны ў небяспечнае Жураўлінае балота з наказам без поўнага вядра не вяртацца. Спагадлівыя духі прыроды дапамагаюць няшчаснаму дзіцяці выканаць і нават перавыканаць жорсткі загад: па вяртанні Каці дамоў журавіны ператвараюцца ў рубіны… Лагічны працяг казачнай гісторыі ў тым, што цяпер ужо Кацечка вядзе мачаху з яе дачкой па тыя рубінчыкі… І што нават мачаха, якая перад гэтым ледзь не штурханула нагой жабу (проста так, ад беспрычыннай злосці), увальваецца ў багну і пачынае тануць… У казках адпаведнае завяршэнне нібы папярэджвае: зло ніколі не застаецца непакараным, рана ці позна расплата цябе знаходзіць. У версіі Станіслава Валодзькі ўсё па-іншаму: добрая Кацечка выцягвае сваю крыўдзіцельку з багны: «З той пары мачаха падчарыцу перастала крыўдзіць. Усе самацветы Кацечцы аддала: калі яна іх знайшла — няхай бацька ёй закажа каралі ў ювелірных спраў майстра. Так баба смерці спужалася і ўдзячнасцю за выратаванне перапоўнілася, што як быццам нанова на свет нарадзілася. Дачка яе, на маці гледзячы, у лепшы бок змянілася. І адразу папрыгажэла…»

У казкі зазвычай прадказальнае завяршэнне, яно павінна трымацца ў межах жанру. Чаго нельга сказаць пра жыццё — яно больш шырокае і не бачыць ніякіх межаў, таму ў ім можа здарыцца самае што ні ёсць неверагоднае. Таму яно і з'яўляецца найчароўнейшай казкай з усіх калісьці складзеных. Гісторыі Станіслава Валодзькі — якраз пра неверагоднае.

Аліса БРАТКА

У мяне ёсць свая ручаінка…

Надзея САЛОДКАЯ

* * *

«Ты павяртайся да роднага слова, —
Мудра параіў шаноўны паэт, —
Там святаянны напой, верасовы,
Там неўміручы даверлівы свет…»

Вёска гамоніць на ёмкай трасянцы,
Сем'і цнатліва сябе берагуць,
Там яшчэ маюцца нейкія шанцы,
Там я са словам радніцца магу…

Сонейка, зернейка, сейбіт, араты…
Шэпт збажыны на ўрадлівых палях…
У палісадзе вяргіні пад хатай,
Хату вартуе раскрылены птах…

Я не пакрыўдзіла здрадай і злосцю
Матчыну мову — я маю іх дзве,
І павяртаюся прошаным госцем
У свой радзінны даверлівы свет.

Мая ручаінка

У мяне ёсць свая ручаінка —
Памяць чэпка трымае ў сабе.
Пачынаўся з лясной лугавінкі
Яе звонкі, імклівы разбег.

Я такой чысціні больш не ўбачу
І такой смакаты не знайду!
Праз жыццё тым каменьчыкам дзячу,
Па якіх, басаножка, іду…

У дзіцячых далоньках — як цацкі,
Імі ў колерах выслана дно…
Я падумала раптам знянацку:
Як бабуліна з кроснаў радно!

Так плыве ад «тады» да налецця
Ручаінка паміж медуніц.
У маім ці не кожным дасвецці —
Гаваркая таемнасць крыніц.

Прытаіліся ў травах мурожных,
Каб напоўніць сабой мой ручай, —
Сёння тупаю я асцярожна
І гляджу на яго з-за пляча…

* * *

Мне далёка да вяршыні верша,
Каб адтуль судзілішча вяршыць,
Ніякога права не займеўшы
Павучаць, як правільна пражыць…

Я, канешне, свет не перайначу
І сабой яго не захіну,
Толькі мушу з горыччу адзначыць
І сваю ў нядобрасцях віну.

Кожны сёння ў нечым вінаваты —
Што недалюбіў,
не зразумеў,
Клунак смецця бруднага ад хаты
Ў рэчку скінуць чыстую пасмеў…

А найгорай, злосцю апантаны,
Кожны кожным хоча кіраваць!
Божанька, Табой на свет пазваным
Можаш болей людскасці надаць?..

Светлачассе

Шчодрыцца лета гамонкай лістоты,
Ветрыкам цёплым, пяшчотна-ласкавым,
Пчолы закладваюць ношкамі соты,
Нікнуць пад косамі спелыя травы…

Кожны руплівец пра зімнюю сцюжу
Думае прыпарнай летняй парою,
Каб як найболей работы адужаць
З верай у лепшае, з добрым настроем.

…Лён, адляжалы на жніўеньскіх росах,
Бабы трапалі, кудзелю спрадалі,
Потым бабуля той кужаль на кроснах
Ткала, і сонца палотны чакалі.

Белы ручнік, вышываны на шчасце,
Кутні абраз абдымаў, красаваўся…
Хто ж тую памяць адолее скрасці!?
Тое, далёкае ўжо, светлачассе…

Іван КАПЫЛОВІЧ

* * *

Пад небам рос, дзе журавы
Са мной з вышыняў гаманілі
Аб тым, душой каб не крывіў,
Каб слухаў продкаў кліч крыві,
У чым, знаў, існавання сіла.

Я слухаў продкаў кліч крыві
І скрозь вясну ішоў у поле.
Чуў шэпт падрослае травы,
І сэрца стук мне гаварыў,
Каб не цураўся сваёй долі.

Каб не цураўся тых людзей,
Якія выжыць памагалі
У небыццё калі глядзеў —
У бездань чорную глядзеў
І спахапіўся — згледзеў далі.

* * *

Непрадказальны быў мой час
І мо ад гэтага ваганні.
Сабе тлумачыў я не раз,
Што трэба жыць не напаказ,
Не засяроджвацца ў чаканні.

Я добра знаў: мне трэба йсці,
Падняцца трэба мне высока.
Каб потым час свой не клясці,
Не стаць абузай у жыцці —
Не пазычаць чужых урокаў.

Я вывяраў свой кожны крок
Хоць у малым, хоць у вялікім:
І што раўніва абярог,
І без чаго ні дня не мог
І што душою клікаў.

* * *

Ісці тым лугам давядзецца,
Дзе з вечара стрыножаны табун.
І сэрца зачасціць, заб'ецца,
Бо коннік ува мне прачнецца
І хутканогі ўбачыцца скакун.

Убачыцца, як ён гарцуе
І вокам усё косіць на мяне.
Бяру за грыву залатую
І сам не свой — нібы святкую.
Скакун міжволі ўдалеч зазірне.

Дзе луг і воля табунова
Сустрэліся аднойчы назаўжды
Пад шум дажджу, гром перуновы.
І след шчаслівае падковы
Пазначыць хуткаплынныя гады.

Ён ціхенька іржэ, бы кажа —
Давай хутчэй цугляй, ды не гані.
Нам шлях любы пад ногі ляжа,
Дарога многае раскажа
Пра гэты свет, адметны ў кожным дні.

* * *

Туліцца вёска да берага
Рачулкі палескай глушы.
Настрою збавіцца шэрага
І зваліцца камень з душы.

Туліцца вёска да бору
І слухае гоман яго.
Слухае час і прастору —
Бярэ ўсё да сэрца свайго.

Пільна глядзіць на дарогу,
Хвалюецца — дрэнна відно.
Думкі абудзіць трывога:
Хто прыйдзе — хіба ўсё адно?

Нехта спяшаецца ў госці
І добрую вестку нясе?
Можа, вяртаецца хтосьці
Дамоў па вячэрняй расе?

Помыслам кожным святая
Глыбокі не ўтоіць уздых.
Мала стрэч гэтых бывае,
Што вартыя слоў дарагіх.

Васіль КУЗЬМІЧ

Наша Прыпяць

Братам і сёстрам прысвячаецца

Зараніца сцяжынку цярэбіць
Праз затоку на водную гладзь,
Дзе рака сваё чыстае срэбра
Гоніць сонцу і далям аддаць.

Ранак лёгкай смугою туману
Паплавы навакол разаслаў.
Наша лодка плыве паслухмяна
За кароткім узмахам вясла.

Прывітанне табе, наша Прыпяць,
Таямніча абсяг твой прыціх,
Не стамляецца шчодра сыпаць
Лета знічкі ў лугах тваіх.

Нам здалося, ты крыху змялела,
Але ўсё ж у сваёй красе,
Нашы мары — да сёння з маленства —
Ты на хвалях у свет нясеш.

Ты ўмееш чакаць і клікаць.
Мы прыйшлі на твае берагі
Не з удачай сваёй вялікай,
Не пра страты сказаць і даўгі.

Ты прымі нашу сціплую споведзь,
Што шчымліва на сэрцы ляжыць,
Яго светлаю скрухаю поўніць, —
Ад цябе ў нас няма таямніц.

Хай пачуюць яе твае воды,
Што стагоддзямі
ў вечнасць імкнуць.
Ці то радасць, ці то нягода —
У душы ты абудзіш вясну.

Споведзь нашу гуллівы вецер
У далоні падхопіць свае,
З ёй у кручы пясчанай дасвеццем
Зімародак гняздо саўе.

Яе госця твая —
чапля шэрая
Панясе за сабой у прасцяг.
Гай дубовы ступіць да берага —
Нашай споведзі дасць працяг.

Яе рэха весткаю ціхаю
З плынню хуткай да вусця сягне,
Дзе з сястрою малодшай Сцвігаю
Ты зліваешся ўсё цясней.

Нам здалося,
ты споведзь шчырую
Прыняла, як малітву, ад нас,
Берагі неўзаметку пашырыла,
Пасвятлела да самага дна.

Заблукаем ад шчасця хмельнага
У затоках і травах густых,
І ніяк па-іншаму нельга нам:
Не адпусціш з палону нас ты.

Фота Кастуся Дробава.

Радок у верш

Прымроіцца радок у верш у сне,
Нібыта здань,
падманна мільганецца,
Няўлоўнаю іскрынкаю блісне,
Здагадкаю апаліць сэрца.
У ім спрасаваны любоў і боль,
Які аціхне аж недзе ўранні,
У ім бясконцая бітва з сабой,
Дзе толькі нябачныя раны.
У ім у згодзе надзея і гнеў
Стаяць за дабро да адчаю,
У ім радасць да неба сягне,
Дзе вечнасць нас асвячае.
У ім дазвання крыўда згарыць,
Зарунее праўда святая…
У гэтым радку пад водбліск зары
Верш новы нарэшце світае.

Заручыны

Ганна АТРОШЧАНКА

Аднойчы ў суботу, зірнуўшы загадкава на дачку, маці паведаміла вось такую навіну:

— Учора сустрэла на вуліцы Меланню Цёмкіну. Помніш, яе маці жыла ў маленькай хатачцы на Клытаўцы? Дык заўтра мяркуе завітаць да нас. І не адна, а з Пятром, сваім братам.

— Чаму гэтую сямейку пацягнула да нас у госці? — здзіўлена перапытала Ірына.

— Надумаўся Пятро жаніцца. Ужо другі раз. Двое дзяцей у яго. Нядаўна вярнуўся з месцаў не вельмі далёкіх. Ты ж, мусіць, не забылася, за што ён там адбываў тэрмін? І не надта маленькі! А за тое, што забіў сваю жонку, калі застукаў яе з палюбоўнікам у ложку. Мусіць, мяркуе цябе пасвататаць.

Маці ўздыхнула, апусціла вочы, ціха прамовіла:

— Глядзі сама, даражэнькая, як быць, што рабіць у дадзенай сітуацыі... Табе ўжо амаль трыццаць гадоў, сямейнае жыццё з Міколам не склалася. Хоць і сцвярджаюць, нібыта адзінокае дрэва і вецер валіць! Але ж, на мой погляд, гэта таксама не самы лепшы варыянт, каб назаўсёды развітацца з адзінотай.

Ірына насупіла чорныя бровы. Амаль са злосцю прамовіла:

— Навошта мне гэты чалавек? Калі казаць шчыра, ён жа значна старэйшы нават за майго брата! Я хадзіла ў чацвёрты клас, а гэты Пятро ўжо з трохгадовай армейскай службы вярнуўся. І яшчэ ён забойца, які зрабіў сваіх дзетак напалову сіроткамі!

Маці згодна кіўнула галавой. Памаўчаўшы хвіліну, сумна прамовіла:

— Некалі Матрона, маці гэтага Пятра, мне паскардзілася, што сын яе абражае. Бывала і такое, калі нават кідаўся з кулакамі. Здаўна вядома: як сын ставіцца да сваёй матулі, так ён будзе «шкадаваць» і сваю жоначку. Дый што можна чакаць ад сынка паліцая? Ад дрэннага семя не чакай добрае племя. Таму і жонку бязлітасна забіў, нават рука не задрыжала...

Выцерла нечаканыя слёзы, працягвала далей:

— Калі прыйшлі захопнікі-немцы ў нашы мясціны, Цёмкін Адась адразу падаўся ў паліцаі. Ніхто нават і не думаў, што такі пануры і рахманы конюх зробіцца здраднікам. Але ж усё тое, чорнае і зласлівае, што хавалася на самым донцы яго душы, адразу выплыла наверх. І нечакана адлюстравала сапраўдныя якасці гэтага чалавека. Хадзіў тады па вуліцы важным, бы той гусак, у чорным мундзіры, яшчэ і са стрэльбай за плячыма. Хваліўся здрадніцкімі нашыўкамі, нямецкімі маркамі. І заўсёды нахабна патрабаваў у сваіх аднавяскоўцаў яйкі, сала. Менавіта для таго, каб пачаставаць вясковымі прысмакамі фрыцаў. Казаў, што абед без мяса — як скрыпка без баса. Асноўны варожы цэнтр месціўся тады ў суседняй вёсцы, у тым будынку, дзе да вайны дзейнічаў сельскі выканкам. Адбіраў усё: адзенне, пасцельную бялізну, розныя харчы. Тады ж было ўсё саматканае, якаснае. Аднойчы сама была сведкай, калі паліцай літаральна зрываў з суседа Цімоха пінжак. Але ж дзядзька аказаўся больш моцным! Хуценька адпіхнуў нахабніка, выхапіў з яго рук стрэльбу. Для прыліку нават прыцэліўся, ды стрэліў над галавой напалоханага Адася. Яшчэ і прыгразіў: маўляў, калі пікнеш пра гэтае здарэнне сваім фрыцам, падпалю тваю хату разам з усёй сямейкай! Стрэльбу, вядома ж, вярнуў. Але ж з той пары Адась хату дзядзькі Цімоха абмінаў.

— А што было далей?— пацікавілася Ірына.— Куды дзеўся здраднік, калі прыйшлі чырвонаармейцы?

— Вядома ж, быў суд. Улічылі тое, што толькі быў служкам у немцаў, нібыта нікога і не забіваў. Адася выслалі кудысьці ў Сібір. Казалі, у тайзе працаваў лесарубам, але ж дахаты так і не вярнуўся. Пэўна, загінуў ад цяжкай працы, а, можа, ад голаду і холаду.

...У нядзелю, у вызначаны час, на парозе з'явіліся «госці». Сястра з братам. Мелання выглядала вясёлай. І нават рашучай.

— Ведаеце, чаму мы сёння да вас зазірнулі? — адразу пасля прывітання, загадкава запыталася Мелання, з цікавасцю азіраючыся навокал.

— Не, не ведаем. Пэўна, вырашылі даведацца нейкія навіны пра аднавяскоўцаў? — хітрыла маці Ірыны. — Але ж вы самі, пэўна, добра ўсё пра ўсіх ведаеце.

Мелання нервова заёрзала на канапе, непрыкметна піхнула пад бок брата. Быццам запрашала да агульнай размовы. Але ж Пятро ўпарта маўчаў, як вады ў рот набраў. Сястра, паправіўшы далікатна сваю пышную прычоску, кашлянула ў кулак. Памусоліла густа пафарбаванымі вуснамі, сказала, кінуўшы погляд на маці Ірыны:

— Наш Пятро жадае ўзяць шлюб з вашай дачушкай. Пра яе вельмі добра адгукнуліся ўсе былыя суседзі-аднавяскоўцы. Як вы да такой прапановы ставіцеся? Усё-такі шмат чаго зараз залежыць і ад маці.

Маці, усміхнуўшыся, паглядзела на дачушку, адразу адказала:

— Пра гэта трэба запытацца не ў мяне, а ў Ірыны!

Мелання згодна кіўнула. І адразу перавяла цяжкі погляд на Ірыну. Мусіць, жаночая інтуіцыя ўжо ёй падказала: нічога добрага з такіх заручын не атрымаецца. І не памылілася, бо пачула вось што:

— Прабачце, але Пятро — вельмі стары. Пра што мы з ім будзем размаўляць? Я ж зусім не ведаю яго. І што мяне чакае ў будучыні? Кожны вечар слухаць пра хваробы, пра лекі, якія не паспрыялі хуткаму выздараўленню... Калі казаць шчыра, старыя мужчыны мне ніколі не падабаліся!

Пачуўшы гэтае, Мелання, быццам уджаленая, хуценька ўсхапілася з канапы, а за ёй і пачырванелы Пятро. Ужо на парозе Мелання са злосцю прамовіла:

— Дык шукай цяперака сабе маладога! Калі такая ўжо занадта ганарлівая, самаўпэўненая...

Калі нязваныя госці выходзілі з кватэры, гучна грукнулі ўваходнымі дзвярыма. Ды так моцна, што нават у адным месцы адляцела тынкоўка...

Вішні цвітуць ва ўсе часы…

Зоя НАВАЕНКА

Гарачае ліпеньскае сонца, не спяшаючыся, гуляла па небе, зазіраючы то ў адны, то ў другія вокны. Вось адзін свавольны праменьчык раней за іншых дакрануўся да твару маленькага хлопчыка, слізгануў па падушцы, і хлопчык прачнуўся. Усміхнуўся сонейку. Устаў і падышоў да акна. Адтуль — шырачэзны праспект вялікага горада, па якім неслі ся машыны ў розныя бакі, а па тратуарах спяшаліся людзі па сваіх справах.

Хлопчыку не было куды спяшацца. Трэба было чакаць з працы цётку Надзю і тату, якія паабяцалі, што пойдуць з ім гуляць. Учора вечарам тата сказаў яму: «Пацярпі, брат! І Масква не адразу будавалася. Аб усім паступова даведаешся, да ўсяго прывыкнеш. Табе хутка сем гадоў, Алік! Ты — мая надзея і любоў!»

А ў Аліка прабуджалася ранейшая любоў да сваёй бабулі Фросі, хворага браціка Валерыка, мамы, дзядзькі Вані.

Мама прасіла называць дзядзьку Ваню татам, але хлопчык хмурыўся і маўчаў. А чарговы раз звяртаючыся да мамінага мужа, усё ж называў яго дзядзькам Ванем.

Бабуля Фрося расказала, што тата Аліка пайшоў на фронт, а потым прыйшла папера, што ён загінуў. Дачушка яе, Вера, маці Аліка, у дваццаць пяць гадоў засталася ўдавой. З маленькім сынам. Прайшоў час, і сустрэла Вера дзядзьку Ваню, які таксама ваяваў, а вярнуўся з гэтай страшэннай вайны інвалідам. Адна нага ўжо назаўсёды драўляная. Прыйшоў дзядзька Ваня дамоў, а там — нікога. Бацьку расстралялі немцы за сувязь з партызанамі, а маці памерла ад тыфу.

Сустрэліся два адзінокія чалавекі: маці Аліка і дзядзька Ваня і зажылі дружна. Нарадзіўся ў Аліка брацік Валерык. Што ж… Алік ужо збіраўся называць татам дзядзьку Ваню, як таго хацелі мама і бабуля. Але здарылася нечаканае.

Прынесла паштарка ліст ад яго роднага таты, у якім той пісаў, што быў у палоне ў фашысцкім лагеры, з якога ўдалося ўцячы невялікай купцы людзей, сярод якіх быў і ён. Забілі многіх-многіх. Яго, на шчасце, куля абышла бокам, і пасля доўгіх праверак дакументаў ён свабодны і вельмі хутка ўбачыць жонку і сына.

Мама Аліка, атрымаўшы гэты ліст, доўга плакала і напісала былому мужу ўсё як ёсць.

Дзядзька Ваня любіў маму Аліка, але ў сям'і была бяда: Валерык нарадзіўся хворы. Мама і праводзіла каля яго ўвесь час напераменку з мужам, які працаваў у калгасе ахоўнікам (а куды з такой нагой?) і днём быў дома.

Бабка Фрося, бачачы пакуты дачкі, забрала Аліка да сябе ў суседнюю вёску. Хлопчык жыў на два дамы: прыбягаў да маці дапамагчы, а потым спяшаўся да бабкі: пакарміць сабаку Палкана, загнаць карову Слабаду ў хлеў, курэй на насест.

Але цяжка гэтым разам Аліку было паслухацца старэйшых. Бабка з вечара была з ім занадта ласкавай, упершыню не прыставала, каб ён называў дзядзьку Ваню татам. Прыбегла да яе ўсхваляваная, разгубленая мама. Як потым аказалася, тата Аліка, які доўга маўчаў, прыслаў ліст з просьбай аддаць хлопца на выхаванне яму.

Пісаў, што ажаніўся з жанчынай, у якой у вайну ад варожага асколка снарада загінуў сынок. У яго ж, пасля перанесеных у лагеры здзекаў, дзяцей ніколі не будзе. Аліку ў верасні ісці ў школу, і, пакуль ён, бацька, жывы, абавязаны паклапаціцца аб лёсе адзінага сына.

Вось і хвалявaліся маці і бабуля. Верасень не за гарамі, а хлопчыку няма за што ні абутку, ні адзежу купіць. А тут яшчэ хворы Валерык. Куды ні кінь — усюды клін.

Аліка ўгаварылі. Хлопчык ён быў паслухмяны. Бачыў, канешне, слёзы бабкі Фросі і чуў галашэнні: «Ах, Божа, Божа! Мачаха — не маці, за ўсё спытае. Ты, унучак, слухайся там яе, не сваволь».

Слухаў Алік бабку, яе прычытанні і думаў: якая ж яна, тая мачаха? Як Баба-яга? Калі бабка так у ёй сумняваецца, значыць, вядзьмарка гэтая мачаха. Галоўнае — не шкоднічаць.

А як ён шкоднічае? Ну, з'елі з Пецькам аднойчы слоік вішнёвага варэння, якое бабка падрыхтавала для хворай суседкі. Яны ж не ведалі! А яшчэ суседскую дзяўчынку-задаваку Зойку дражнілі. А няхай не задаецца. Вось і ўсе шкодніцтвы. А вішнёвага варэння хуткчэй за ўсё ў мачахі няма.

А бабка за сваё: «Слухайся, унучак, мачаху. Тата абяцае наступным летам цябе прывезці на пабыўку».

А калі яшчэ тое лета, думае Алік. Ці прывязуць Зойку да бабкі Каці? Ці паспеюць да яго прыезду вішні? Вішні абступаюць старую хату дружнай сям'ёй. «Эх! У горадзе не растуць вішні», — думаў хлопчык.

…У вялікім горадзе Кіеве сустрэла на вакзале тату і Аліка прыгожая цётка Надзя. Яна была чымсьці падобная на тату, і Алік адразу вырашыў, што гэта яго сястра. З палёгкай уздыхнуў. Галоўнае — мачахі нідзе не відаць. Дарэмна бабка Фрося яго пужала. Ну гэта, напэўна, пакуль ён прывыкне, а потым і мачаха аб'явіцца — падумаў Алік. Вырашыў, што будзе слухацца, старацца добра вучыцца, каб наступным летам адвезлі яго ўсё ж туды, у вёску, дзе ёсць ласкавы Палкан, задавака Зойка і верны сябра Пецька.

Пасля гарачай ванны і вячэры лёг спаць.

А зранку разбудзіла хлопчыка сонейка. Алік пайшоў на кухню, дзе, вырашыўшы па звычцы дапамагчы дарослым, паставіў талеркі, расклаў лыжкі. І ў гэты момант прыйшоў тата. Убачыўшы старанні сына, засмяяўся: «Ах, ты мой гаспадар! Вось малайчына!» Ён падхапіў Аліка і пасадзіў сабе на калені. Калі на кухню прыйшла цётка Надзя, хлопчык і не заўважыў.

А яна ўзяла вялікую міску, паставіла яе на стол і высыпала цёмна-бардовыя, пахучыя вішні.

— Вішні паспелі! Прадаюць садаводы нядорага.

Алік ва ўсе вочы глядзеў на міску з вішнямі. Такіх вялікіх ён не бачыў і, нечакана для сябе, асмялеў:

— Цётка Надзя, а дзе мая мачаха? Я буду слухацца тату і цябе, а да мачахі не пайду!

Цётка Надзя чамусьці пачырванела, разгублена зірнула на тату. А тата пацалаваў хлопчыка і супакоіў:

— Ну што ты, сынок! Не аддадзім мы цябе ніякай мачасе. Там жа, у вёсцы, у цябе ёсць родная мама, і мы да яе паедзем. Скажы: «А цёцю Надзю возьмем з сабой?»

Алік засмяяўся:

— Цёцю Надзю возьмем. Абавязкова. Яна добрая.

— Тады давайце есці вішні, — засмяялася цётка Надзя.

* * *

Праз шмат гадоў па вуліцы маленькай старэнькай вёсачкі ішоў статны мужчына. Была Радаўніца. Ён ішоў на могілкі, але завярнуў да хаткі, дзе калісьці жыла яго бабка.

Патаптаўшыся, знайшоў старую вішню, пад якой калісьці ён, Зойка і Пецька пахавалі Палкана. Пакланіўся нізка хатцы і хуткім крокам пайшоў па вуліцы. Вакол — чужыя лецішчы. І раптам нехта паклікаў: «Алік!»

Ён павярнуўся. Да яго спяшалася маладая жанчына.

— Зоя! — Ён кінуўся ёй насустрач.

— Ой, а мы з Пецем сядзім каля акна і глядзім: ты ці не? Хадзем да нас, тут наша лецішча. Паглядзі, колькі вішань насадзілі.

Святло нябеснай зоркі

Лясы бываюць розныя. Па-навуковаму кажучы, лес — гэта экалагічная складаная сістэма, у якой, зноў жа, карыстаючыся спецыфічнымі паняццямі, мноства звенняў. У ім растуць кусты, лішайнікі, травы, імхі, грыбы, водзяцца жывёлы. Знаходзяць прыстанішча розныя мікраарганізмы. І кожная расліна ці жывая істота складаюць неад'емную частку вялікай сістэмы. Але навука, што таксама вядома, — такая дзейнасць, якая, замыкаючыся ў сабе, не заўсёды можа прыняць пад увагу тое, што не ўваходзіць у сістэмы яе зацікаўленасці, дзейнасці. Там свае законы і ўласныя высновы. Таму ў спецыяльных навуковых даследаваннях не прачытаеш, як, скажам, пэўныя аспекты вядзення лясной гаспадаркі адлюстраваны ў літаратуры.



Фота з сайта novayagazeta.ru

Ігар Шклярэўскі.

Тым больш ні ў адной працы не напаткаеш звестак, што на Беларусі ёсць лес, пасаджаны пісьменнікам, які працаваў на сумежжы беларускай і рускай літаратур. Хоць творы і былі рускамоўныя, але па духу, па шмат якіх рэаліяй — беларускія. З'явіўся гэты лес дзякуючы лаўрэату Дзяржаўнай прэміі СССР Ігару Шклярэўскаму. Ігар Іванавіч, атрымаўшы высокую ўзнагароду за кнігу «Слушаю небо и землю», на сродкі ад яе пасадзіў непадалёку ад Петрыкава 18 гектараў лясных насаджэнняў. Зрабіў гэта для таго, каб палешукі менш адчувалі на сабе ўздзеянне радыяцыйнага забруджання. Дарэчы, матэрыяльна ён дапамагаў і некаторым перасяленцам. А тыя з іх, хто цікавіцца літаратурай, як увогуле аматары прыгожага пісьменства, атрымлівалі задавальненне (ды і сёння атрымліваюць) ад яго паэзіі, а таксама ад выкананых ім перакладаў твораў беларускай літаратуры на рускую мову, бо Ігар Шклярэўскі з'яўляўся і свайго роду паўнамоцным прадстаўніком Беларусі ў Маскве і ўвогуле ў саюзных рэспубліках. Чытаючы яго паэзію, захапляючыся яго творамі, аднак, далёка не ўсе здагадваліся, што шлях у творчасць быў не такім і простым, як можа падацца. Хоць чаму здзіўляцца! Так было раней, гэта назіраецца і сёння. Бадай, будзе назірацца і ў будучыні. Пішчом у літаратуру, асабліва ў паэзію, лезуць тыя, каму, на добры лад, супрацьпаказана ёю займацца.

Каб ісці — трэба падтрымка

Творчы шлях Ігара Шклярэўскага не адны ружы ўсцілалі. Гаворка, зразумела, не пра тое, што знаходзіліся і па сённяшні дзень знаходзяцца зайздроснікі — у каго іх няма, асабліва ў таленту такога высокага кшталту, як у Ігара Іванавіча. «Падножку» яму падставілі перад падрыхтоўкай да друку яго першай кнігі «Я иду». Чыноўнік з Галоўліта, у абавязкі якога ўваходзіла сачыць, каб ніякая крамола не прайшла ў друк, аказаўся не проста пільным, а звышпільным. Яго не мог не насцярожыць гэты безназоўны верш паэта-дэбютанта:

<…> — Люблю, —
фальшивит кто-то на углу.
Зарядка началась. Фальшивят марши.
Фальшиво улыбается с афиш
лицо вчера любимого артиста.
Обдало дымом!
— Эй, куда летишь, —
взаправду гаркнули мотоциклисты…

Занепакоіўся цэнзар. Гэта трэба асмеліцца напісаць «фальшивят марши»! Далей яшчэ ўважлівей, а той, хто шукае… Знайшоў і яшчэ больш «крамольнае». Выснова з'явілася такая, якую і трэба было чакаць: рукапіс зарэзаць! Кніга так бы і не выйшла, калі б Ігар Шклярэўскі пра сваю бяду не расказаў паэту Навуму Кісліку. Сам Навум Зіноўевіч уратаваць рукапіс, канешне, не мог. Але паведаў усё, як ёсць, Петрусю Броўку. Гэта сёння шмат ахвочых абвінаваціць Петруся Усцінавіча ў розных грахах, да якіх ён не мае ніякага дачынення. А многія пісьменнікі ўспаміналі яго толькі добрым словам. Прынамсі, яго зямляк Рыгор Барадулін. Так ставіўся да Петруся Броўкі і Ігар Шклярэўскі. Падтрымка не толькі зрушыла справу з месца. Рэдактарам рукапісу прызначылі не менш вядомага і аўтарытэтнага паэта Пімена Панчанку.

Кніга «Иду!» выйшла ў 1962 годзе. Праз два гады з'явілася наступная — «Лодка». Трэцяя — «Фортуна» — у 1968 годзе пабачыла свет у Маскве. У Маскве ўжо жыў і яе аўтар, а сэрцам… Сэрцам застаўся з Беларуссю. І са сваімі роднымі Бялынічамі. З імі быў да апошніх дзён жыцця.

Анёл з піянерскай трубой — не прыдуманае

З прызнання ў любові да малой радзімы пачынаў ён і кароткую аўтабіяграфію «О себе», змешчаную ў кнізе «Избранное», што выйшла ў 1984 годзе ў выдавецтве «Художественная литература». Пісаў як на споведзі, дзяліўся самым запаветным: «Самае моцнае ў чалавеку — яго пачатак. Ён патаемна верхаводзіць усім жыццём. Не дзяцінства, а пачатак: вялікія навальніцы і паветра дома. Справы краіны і думкі бацькі… Я нарадзіўся 25 чэрвеня 1938 года ў беларускім пасёлку Бялынічы. Вакол яго — хвойныя лясы, дзе заўважна бялее бяроза, бульбяныя палі і тарфяныя балоты. Бацька быў гісторыкам, настаўнікам у школе».

У моўную тканіну аўтабіяграфіі адразу ўваходзіць верш, што яскрава перадае адзін з малюнкаў маленства:

Свет пробегает по стене.
И вот в огромной тишине
на станции лесной
отец рассказывает мне
о первой мировой войне
за месяц до второй.

З пачаткам вайны была эвакуацыя на Урал. З заканчэннем яе — вяртанне на радзіму, да той прыроды, якую палюбіў будучы паэт з маленства, да ракі дзяцінства — Дняпра: «Я ўжо не адрозніваю сябе ад дрэва, ад пяску. Пасля ўзнікла іншая роднасць — рака навучыла мяне сустракаць і праводзіць кожнае імгненне адначасова». Паэзія прысутнічала наўкола, паэзія нараджалася ў яго душы. Прызнаецца: «Мне пашанцавала. Дома не шапталіся, не шушукаліся. Нічога не хавалі. Нават штор у нас не было, праўда, не ад беднасці».

Дома была багатая бібліятэка: «Сустракаў бацьку пытаннем: "Прынёс хлеб?" Ён даставаў з партфеля хлеб і чарговы том Гогаля, Чэхава, Талстога.

Вершы я складаў на вуліцах, бацьку і маці свае таямніцы не давяраў і ад паўнаты пачуццяў не гаварыў шчыра».

Яшчэ ў адным вершы малюнак маленства, падобны на перажытае многімі дзецьмі ў вайну:

Ветер холодный дует с реки.
Мы собираем в полях колоски.
Голые ивы. Церковь без крыши.
Ангелы в небо летят со стены.
Плачут голодные птицы и мыши,
в поле далёкие горны слышны.
Я колоски, колоски собираю
и на соломе сырой засыпаю,
и высоко над холодной страной
ангел летит с пионерской трубой.

Слова вярнула да «Слова…»

Скончыўшы Бялыніцкую сяроднюю школу, паступіў у Магілёўскі педагагічны інстытут. Аднак хутка развітаўся з ім. Быў фармоўшчыкам, токарам на магілёўскіх заводах, служыў матросам гандлёвага флоту на Далёкім Усходзе, працаваў у рэдакцыі раённай газеты «Приморский край».

Гэтая праца, як няцяжка ўпэўніцца, часам была далёка не паэтычная, але ён пастаянна жыў паэзіяй. Як і дагэтуль, яшчэ ў юныя гады, нярэдка паэтычныя радкі нараджаліся ў яго не за пісьмовым сталом. Прамаўляў іх уголас, куды-небудзь ідучы. Пасля занатоўваў найбольш значнае на паперу. Так і ствараліся кнігі «Я иду!». У аўтабіяграфіі прызнаваўся: «Я напісаў яе па дарозе ад горада да вода. Пакуль ішоў — складаў».

Знаходзячыся далёка ад Беларусі, марыў прыехаць у Бялынічы вядомым паэтам, у прыгожым касцюме, каб усе азіраліся, цікавіліся: «Гэта ж той самы». З іранічнай усмешкай заўважае: «Спазніўся! Калі прыехаў — усе ўжо хадзілі ў прыгожых касцюмах».

Наконт касцюмаў — праўда. Праўдзіва і тое, што некаторыя з сяброў і вершы спрабавалі пісаць. Сёй-той і ў раённай газеце друкаваўся. Аднак сапраўдным Паэтам стаў толькі ён адзін. І не толькі паэтам, але і празаікам. Выдаў кнігу з трох аповесцей «Тень птицы», зборнік артыкулаў аб літаратуры «Поэзия — львица с гривой». Юным чытачам адрасавана кніга «Читаю "Слово о полку…"», у якой дзеліцца думкамі аб гэтым выдатным літаратурным помніку, разважае аб яго персанажах, аб паэтычным адлюстраванні ў ім прыроды, харства роднага краю. Надрукаваў у ёй і свае вершы, матывы якіх навеяны «Словам…». Сярод іх і гэты — «Сон перад навальніцай»:

Я «Слово о полку…» прочел.
И окна приднепровских сел
пылают красными щитами.
Бегу оврагами, кустами.
Вдруг потемнело все кругом.
И шорох тучи страшно близок,
как будто развернулся список
и в поле выкатился гром!

Паром, што не спыняецца

Яго пераклад «Слова пра паход Ігаравы» па-руску атрымаўся настолькі цудоўны, што яго прызналі лепшым з усіх, зробленых у XX стагоддзі. Дзмітрый Ліхачоў пісаў яму: «Памятайце, Вы — сапраўдны паэт, Вы не вершатворац. Паэзія — гэта нешта больш высокае… Вы патрэбны рускай культуры, таму клапаціцеся пра сябе, як пра нацыянальны набытак».

Цудоўным атрымаўся ў Ігара Шклярэўскага і вольны пераклад «Паэмы пра зубра» Міколы Гусоўскага. А паводле «Сказания о Мамаевом побоище» ён напісаў паэму «Слово о Куликовом поле». «Слово о полку Игорове» ўвайшло і ў кнігу «Слушаю небо и землю». Арыгінальнае выйсце — пасадзіць лес на берагах Прыпяці — знайшоў невыпадкова. Ёсць у яго нават кнігі аб рыбнай лоўлі, збіранні грыбоў. Яны карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў аматараў ціхага палявання. Запатрабаваны не толькі ў Расіі і на постсавецкай прасторы. У перакладах выходзілі ў шмат якіх краінах.

І сам Ігар Шклярэўскі, як ужо казалася, перакладаў шмат. Толькі некаторыя імёны тых, хто, дзякуючы яму, «загаварыў» па-руску: Янка Купала, Максім Багдановіч, Рыгор Барадулін, Пятрусь Броўка, Генадзь Бураўкін, Анатоль Вялюгін, Пімен Панчанка, Аляксей Пысін, Максім Танк. Кніга яго перакладаў трапна называецца «Паром из Белоруссии в Россию». А па-беларуску Ігара Іванавіча пераўвасаблялі Рыгор Барадулін, Віктар Ярац і іншыя.

Наколькі значнае месца ў творчасці Ігара Шклярэўскага займае беларуская праблематыка, можна ўпэўніцца, пазнаёміўшыся з яго кнігай «Ожерелье сушеных грибов». У ёй прадстаўлена як яго ўласная паэзія, так і пераклады «Песні пра зубра» і «Слова пра паход Ігаравы», а таксама эсэістыка, дзякуючы якой паўстаюць воблікі тых, хто прапісаўся ў яго біяграфіі. А ў «Радуге Олега Шкляревского» ён расказвае пра свайго малодшага брата, стваральніка дакументальных фільмаў «Тонежскія бабы» і «Пранясі, Божа, хмару».

Кнігу «Держись, …!» адрасаваў хворым, якія трапілі ў бальніцу. У кожнага, хто пазнаёміцца з найлепшымі вершамі з сусветнай літаратуры, настрой адразу ўзнімецца. З'явіцца ўпэўненасць у выздараўленні, захочацца жыць, радавацца людзям і свету. Гэтаму дапамагае і паэзія самога Ігара Шклярэўскага. Ён не толькі лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Быў кавалерам ордэна Дружбы народаў. Меў і іншыя літаратурныя ўзнагароды: Залаты знак паэтычнага тэатра (Балгарыя), прэмія «Болдинская осень», Царкасельская прэмія, Пушкінская прэмія Расійскай Федэрацыі, прэмія штотыднёвіка «Литературная Россия», Грамата экзархата Беларусі «Во внимание к трудам на ниве церковной, в память 2000-летия Рождества Христова».

* * *

У яго было ўсё, як у звычайнага чалавека. Аднак, паколькі з'яўляўся паэтам, у нечым і не так, як у іншых людзей. Пра гэта верш «*** Опять звезда прольется…»:

Опять звезда прольется
в ночную колею
и воздух разобьется
о голову мою!

Опять в унылом поле
бездонная весна.
Две у поэта доли,
но воля есть одна!

Хотел бы то и это
при жизни ты успеть.
Две жизни у поэта,
но между ними смерть…

Не стала Ігара Шклярэўскага 7 верасня 2021 года — на жаль, і яго не мінуў ковід. Вечны спакой знайшоў на Машакоўскіх могілках у Магілёве поруч з бацькамі. Такой была яго апошняя воля, якую выканалі малодшы брат Алег Іванавіч і яго дачка Марыя 14 жніўня 2022 года. Частку праху развеялі над Дняпром. Гэта мясціны, дзе ў маленстве любіў рыбаліць. Другая — на высокім схіле крапаснога вала, каля гарадскога парку. У гэтым месцы яму хораша пісалася.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Сорак трэці

Супрацоўнікі Літаратурнага музея М. Багдановіча імкнуцца трымаць на кантролі ўсе экзэмпляры «Вянка» (Вільня, 1913), адзінага прыжыццёвага зборніка паэта, якія захаваліся. Да нядаўняга часу ў полі даследчыцкага бачання былі 42 асобнікі, што знаходзяцца ў дзяржаўных і прыватных зборах Беларусі і замежных краін. Сёлетняя акцыя «Вянок "Вянкоў"», зладжаная ў мінскім музеі песняра чыстай красы, падахвоціла больш уважліва пераглядзець некаторыя айчынныя кнігасховішчы.

І недарэмна. 43-ці экзэмпляр выяўлены ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Пра дзве кнігі, якія захоўваюцца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў, было добра вядома раней, але даследчыкі чамусьці абыходзілі ўвагай іншыя структурныя падраздзяленні гэтай сталічнай установы.

Чарговы, раней не апісаны багдановічазнаўцамі «Вянок», — з ліку найлепш захаваных, прафесійна пераплеценых. Нягледзячы на адсутнасць інскрыптаў і якіх-небудзь памет, кніга мае сваю гісторыю, зафіксаваную найперш праз інфармацыю аб адным з ранейшых уладальнікаў. Расшыфроўка гэтай гісторыі толькі пачынае свой шлях.

Акрамя штампа «Библиотека АН БССР», на першай і чацвёртай старонках вокладкі, уклейцы аб друкарскіх памылках, а таксама старонках №№ 5, 37, 69, 97, 117 стаіць круглая пячатка з тэкстам на латгальскай мове, які сведчыць, што зборнік належаў беларускай пачатковай школе ў Люцынскім (Лудзанскім) павеце:



З фондаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

Максім Багдановіч «Вянок» (Вільня, 1913).

«Piteru boltkivu pāmatškola. Ludzas apriņķa». А вось пра які канкрэтна населены пункт *(Piteru)* Латгаліі, усходняга гісторыка-культурнага рэгіёна Латвіі, ідзе гаворка — на гэтае пытанне сходу не адкажаш. Асабліва калі ўлічыць існаванне назваў у дзвюх памежных культурных традыцыях, беларускай і латышскай, — Дзвінск/Даўгаўпілс; перайменаванне вёсак на розных гістарычных этапах, іх знікненне ў сувязі з працэсамі ўрбанізацыі. У 1920-х гг. была праведзена латышызацыя: мянялі прозвішчы людзей, назвы населеных пунктаў: Бальбінова → Індра; Пустыня → Робежнік; Бароўка → Скайстай...

Першасны этап узнаўлення летапісу адукацыйнай установы ў Латвіі дазволілі з пэўнасцю ўстанавіць, што гаворка ідзе пра вёску Пітэры (лат. *Pītera*) і, адпаведна, — Пітэрскую беларускую пачатковую школу, заснаваную ў 1921 годзе. Для яе патрэб здымаўся прыватны будынак. У 1929-м, праз год пасля пераезду ў сядзібу Усціна Пікарэўскага, школа была перайменавана ў рускую. За дзесяцігоддзе колькасць навучэнцаў істотна не змянілася: калі ў 1921-м яе наведвалі 54 вучні, то ў 1931-м — 62. У ліку першых кіраўнікоў пачатковай школы былі Браніслаў Сухарэўскі і Канстанцін Нікіфароўскі.

Існаванне беларускіх адукацыйных устаноў у прыбалтыйскай краіне 1920-х гг. гісторыкі называюць фенаменальным, бо яны ўзніклі без аніякай папярэдняй базы, што называецца, на пустым месцы. Фарміраванне іх бібліятэчных збораў, акрамя ўсіх іншых праблем, ішло з вялікімі цяжкасцямі, не хапала падручнікаў. У гэтай сувязі ацалелы экзэмпляр «Вянка» сёння бачыцца ў сваёй сімвалічнай місіі пераемнасці беларускай нацыянальнай ідэі, мастацкай творчасці і падзвіжніцкай дзейнасці.

Педагагічны штомесячнік «Беларуская школа ў Латвіі» (1927, № 4) змясціў матэрыял да 5-годдзя Люцынскай беларускай пачатковай школы. Сціслы агляд

З кнігі «Альбом Лудзанскай павятовай школы» (1937).

Будынак Пітэрскай беларускай пачатковай школы (Латвія, Лудзанскі павет). 1920-я гг.

сведчыў яе надзвычай важную ролю для нацыянальнай меншасці ў горадзе: «Беларусы ў Люцыне складаюць самую незаможную частку насельніцтва: у большасці гэта беззямельнае сялянства, пайшоўшае ў горад на заробкі, ёсць мясцовае люцынскае мяшчанства і рамеснікі, якія ніяк не могуць аправіцца пасля вайсковае завірухі і розных эвакуацыяў і акупацыяў, ды не мала ёсць і былога "служылага" люду, які цяперака сядзіць без пасадаў, бо ня ведаюць латышскае мовы».

Пячатка на выяўленым 43-м экзэмпляры «Вянка».

Не аптымістычная карціна паўстае перад намі ў дачыненні да навучэнцаў школы: «Не было ў іх ні вопраткі, ні абутку, ні грошы на сшыткі і кніжкі, а шмат хто з дня ў дзень рэгулярна галадаваў. Беларуская школа, пачынаючы з лютага 1922 года, ішла ўсім гэтым дзецям чым толькі магла на спатканне. Вечарынамі, латарэямі, працэнтнымі адлічэннямі ад пенсіі настаўнікаў збіраліся грошы на сшыткі, кніжкі і гарбату для вучняў; шмат каму давалася вопратка і абутак».

У сістэме пачатковай і сярэдняй адукацыі нацыянальных меншасцей у Латвіі 1920-х гг. найбольш вядомая Люцынская дзяржаўная беларуская гімназія (г. Люцын/Лудза, 1922 — 1925), чатырохкласная ўстанова, у якую набіраліся вучні з навакольных пачатковых школ. Вялікая ўвага тут надавалася эстэтычнаму, творчаму навучанню. Пры гімназіі існаваў драматычны гурток. Пастаноўкі 1923 — 1924 гг., сярод якіх і неўміручая «Паўлінка» Янкі Купалы, ладзіліся не толькі ў горадзе, але і ў розных вёсках Люцынскага краю. Навучэнцы збіралі і запісвалі беларускі фальклор, выдавалі літаратурны часопіс «Ластаўка».

Пасля закрыцця ўладамі Латвіі гімназіі ў Люцыне частка навучэнцаў перабралася ў Дзвінскую дзяржаўную беларускую гімназіі. Адной з яе выпускніц была Людміла Краскоўская (1904 — 1999), у далейшым выбітны археолаг і спецыяліст музейнай справы ў сацыялістычнай Чэхаславакіі; першая жанчына ў гэтай краіне — кандыдат гістарычных навук. «Вянок» з яе кнігазбору захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Сёлетнім чэрвенем ён прыняў эстафету чарговага ключавога экспаната на выстаўцы «Вянок "Вянкоў"».

Выяўлены 43-ці аўтэнтычны зборнік М. Багдановіча не толькі колькасна павялічвае захаваную кніжную спадчыну класіка літаратуру, але і сведчыць гісторыю беларускай культурнай чыннасці ў розных еўрапейскіх краінах, адкрывае перспектыву для далейшых росшукаў і даследаванняў.

Мікола ТРУС,
кандыдат філалагічных навук

Рускі паэт з Дабраўлянаў

На Смаргоншчыне, паблізу ад Жодзішак, ёсць вёска з прыгожай, сімпатычнай назвай — Дабраўляны. Яна і ўваходзіць у Жодзішкаўскі сельсавет. Жыхароў сёння тут зусім няшмат. Усяго меней чым сто чалавек.

Некалі паселішчам валодалі Зяновічы, пасля падкаморнік Адам Роскі. 1526 год — вёска згадваецца як валоданне Леона Роскага Барэйшы. Былі гаспадарамі Дабраўлян Свірскія, Стаброўскія, Падбіпяткі, Войцех Жабінскі… І нават князь Геранім Сангушка, апошні ваявода валынскі… У 1824 годзе граф Адам Гюнтэр і яго жонка Аляксандра Канстанцыя Гюнтэр (з Тызенгаўзаў) заклалі вуглавы камень пад новы палац у Дабраўлянах. Жыццё ў гэтых мясцінах апісана ў мемуарах іх малодшай дачкі — Альбіны Габрыелы Пузыны з Гюнтэраў (1815—1869)… Не меней цікавымі падаюцца іншыя гістарычныя старонкі жыцця Дабраўлян і яе насельнікаў.

У 1888 годзе, 17 студзеня, у Дабраўлянах нарадзіўся рускі паэт і празаік Артур Сігізмундавіч Хамінскі. Звестак пра жыццё літаратара даволі мала. Вядомы такі факт: уладальнік маёнтка Дабраўляны бацька паэта інжынер Сігізмунд (Зыгмунт) Станіслававіч (1860—1937) прайграў свае ўладанні ў карты. Маці літаратара — Францішка (нараджэннем Горват) памерла 9 лютага 1888 года, калі будучаму паэту быў усяго толькі месяц. Дарэчы, дзед Артура Хамінскага — Станіслаў Фадзеевіч Хамінскі (1807—1886), ваенны губернатар Ковенскай губерні, валагодскі губернатар у 1861—1878 годзе, генерал-лейтэнант. Нарадзіўся на Мядзельшчыне…

У 1906 годзе Артур закончыў Першую кіеўскую гімназію. Напрыканцы 1900-х — у пачатку 1910-х гг. Хамінскі выдаў у Кіеве і ў павятовым горадзе Кіеўскай губерні Звянігарадку некалькі паэтычных кніг на рускай мове, а таксама зборнік прозы: «Для страстной мечты» (1908), «Обман» (1913), «Счастье» (1913), «Уют Дженкини» (1914), «Моя осень» (1914), «Возлюбленная псу: Сильная поэма» (1916). Як правіла, кнігі Артура



Хамінскага выходзілі накладам у 100 экзэмпляраў. Магчыма, і гэтая абмежаванасць у тыражах з'яўляецца прычынай малавядомасці нашага земляка ў літаратурнай біяграфіі XX стагоддзя.

Артур Хамінскі быў прыхільнікам творчасці вялікага рускага паэта Аляксандра Блока. Напісаў яму два лісты. У адным з іх расказаў пра заснаванне таварыства імя Блока. Рабіў спробы сустрэцца з Аляксандрам Аляксандравічам, які ўжо быў на той час легендай Сярэбранага паэтычнага веку. Але ці прыхільнікі настолькі дакучалі аўтару «Вершаў пра Прыгожую Даму» і «Снежнай маскі», ці паўплывалі нейкія іншыя прычыны, сустрэча ўсё ж не адбылася. Ды і Першая сусветная вайна пачала дыктаваць новыя абставіны. Блок трапіў на беларускае Палессе. А жыццёвыя сляды Артура Хамінскага пасля 1915 года згубіліся… Гісторыя літаратуры XX стагоддзя напоўнена рознымі легендамі. Можа, сляды Хамінскага трэба шукаць у краінах, куды з Расійскай імперыі хлынулі патокі эміграцыі — прыкладам, у Кітаі ці ў адной з краін Еўропы?..

На пачатку новага XXI стагоддзя былі зроблены некаторыя спробы ўзнавіць імя, творчасць нашага земляка. У маскоўскім выдавецтве «Водолей» у 2013 годзе пабачыла свет асобнае выданне творчай спадчыны «Возлюбленная псу. Полное собрание сочинений». Укладальнікам і выдаўцом выступіў Аляксандр Львовіч Собалеў. З'явілася рэцэнзія ў прэстыжным часопісе «Новый мир». На кнігу адгукнуўся і літаратуразнаўца Алег Юр'еў. Вось што, у прыватнасці, ён напісаў: «…Хамінскі — той рэдкі ў гісторыі літаратуры выпадак, калі развіццё і змена мадэляў, у тым ліку альтэрнатыўныя варыянты, дэманструюцца як быццам адначасова, гэта значыць, як мінімум у межах аднаго тэксту. Асабліва гэта заўважна ў прозе, паколькі паэтычныя тэксты валодаюць куды большай стылістычнай інерцыяй і доўгі паток аднародных стылістычных блокаў (спарша гімназічнай лермантаўшчыны, пасля побытавага сімвалізму) толькі вельмі коратка перабіваецца дзіўным паваротам звычайна абсурднай ці абсурдна-натуралістычнай дэталі».

…Відавочна, каб шырэй зразумець велічыню асобы паэта — ураджэнца Дабраўлянаў, трэба прачытаць яго вершы і паспрабаваць болей уважліва зазірнуць у атмасферу, у якой ён жыў, фарміраваўся як асоба… Можа, з часам гэта і атрымаецца зрабіць праз нястомны гісторыка-літаратурны пошук…

Кастусь ХАДЫКА

З эпохі магутных людзей

Нядаўна ў Нацыянальным мастацкім музеі адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі найлепшых дыпломных работ выпускнікоў Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава і ўручэнне дыпломаў. Праект традыцыйны — «Глебаўка» стала сябруе з Мастацкім. Між тым незадоўга да падзеі ў музеі размясцілася яшчэ адна знакавая экспазіцыя — «Аляксей Глебаў. Услаўляючы чалавека», якую можна ўбачыць да 13 жніўня. Яе куратарам стала Анастасія Карнейка, старшы навуковы супрацоўнік аддзела беларускага мастацтва XX—XXI стст., захавальнік калекцыі «Беларуская скульптура».

Сёлета споўнілася 115 гадоў з дня нараджэння народнага мастака БССР, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, скульптара і педагога Аляксея Канстанцінавіча Глебава. Мастак пражыў

Андрэй Заспіцкі «Партрэт народнага мастака БССР А. К. Глебава», 1970 г. (адліў — 1974 г.).

60 гадоў (не стала яго ў 1968-м) і, вядома, не паспеў ажыццявіць усё з задуманага. Мабыць, таму многія, хто з ім быў знаёмы, са шкадаваннем гавораць пра майстра, некаторыя сустрэчы адгукаюцца надзвычай шчымлівымі ўспамінамі. Так, частая госця на ўрачыстых адкрыццях выставак, звязаных з творчасцю Аляксея Глебава, — Галіна Уладзіміраўна, жонка малодшага сына скульптара Аляксандра Аляксеевіча. Яна заўсёды расказвае аб тым, якім ветлівым і пяшчотным быў Аляксей Канстанцінавіч, як ён быў неабходны калегам і студэнтам.

— Ён валодаў віртуознай тэхнікай, — падкрэслівае генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Ганна Конанава. — У творчасці скульптара дынаміка і экспрэсія сілуэта заўсёды спалучаюцца з мяккай, тонкай, далікатнай мадэліроўкай дэталяў, формы. У яго самых знакамітых творах, прысвечаных партызанам Беларусі, партрэтах Янкі Купалы, Якуба Коласа, Францыска Скарыны максімальна выяўлена нацыянальная душа — беларуса і чалавека мастацтва, які любіць сваю краіну.

У стварэнні экспазіцыі ў Нацыянальным мастацкім музеі паўдзельнічалі Беларускі саюз мастакоў, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў. Дэманструюцца таксама дакументы і фатаграфіі з асабістага архіва скульптара Аляксандра Каструкова і архіва сям'і Аляксея Глебава. Здымкі, дарэчы, надзвычай каштоўныя. Уражвае іх колькасць, здзіўляе іх высокая якасць. Адзіная праблема — арганізатары не палічылі неабходным пазначыць хоць нейкія звесткі: кім, дзе і калі быў зроблены здымак, хто на ім выяўлены. Але, дзякуючы праекту, можна паглядзець відэафільм і радыёперадачу аб скульптары з унікальнымі запісамі голасу мастака з фондаў Белтэлерадыёкампаніі.

Дапаўняюць экспазіцыю жывапісны, скульптурны і графічныя партрэты Аляксея Глебава, створаныя яго калегамі, са збору НММ. Майстра ў свой час адлюстравалі Яўген Ціхановіч, Андрэй Заспіцкі, Аляксандр Мазалёў, Міхаіл Лісоўскі…

Увогуле выстаўку можна лічыць рэтраспектыўнай: яна расказвае пра асноўныя перыяды творчасці Аляксея Глебава (з ваенных да апошніх гадоў жыцця). Тэмы, матывы, героі, перавагі — усё навідавоку.

— Пэўным чынам экспазіцыя дэманструе вобраз эпохі, для мяне ён надзвычай важны, — падкрэслівае першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля Шаранговіч. — Гэта была эпоха магутных людзей, тых

Фрагмент экспазіцыі.

Аляксей Глебаў «Партрэт У. І. Уладамірскага», 1948 г.

скульптараў, якія сапраўды ствараліаблічча Беларусі. І яно пераконвае. Колькі прайшло гадоў, а гэтыя работы упэўніваюць і натхняюць, малююць вобраз прыгожай і мужнай краіны, якая рухаецца наперад.

Пераасэнсоўваючы спадчыну Аляксея Глебава, мастацтвазнаўцы шмат увагі надаюць яго працы над помнікам Францыску Скарыну. Вядома, што да вобраза першадрукара скульптар звярнуўся ажно ў 1946 годзе. Толькі ў 1967-м з'явіўся макет праекта помніка Францыску Скарыну для Полацка, калі ў майстра ўжо не ставала сіл на стварэнне, але былі мары пра вялікі помнік з бронзы. Пасля яго смерці работу завяршылі былыя вучні скульптара Ігар Глебаў і Андрэй Заспіцкі. У 1976 годзе (пасмяротна) Аляксей Глебаў быў удастоены Дзяржаўнай прэміі Беларусі за гэты твор.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

Публіка выбірае дасканаласць

Юрый Пеўнеў «Боль», 2022 г.

З месца ў кар'ер! Каментарыі пад публікацыяй Палаца мастацтва ў Instagram, дзе гаворыцца пра пераможцаў галасавання гледачоў на фестывалі мастацтва «Арт-Мінск»: «Чаканыя рэзультаты, зрэшты, як заўсёды»; «За каго галасавала, тыя і выйгралі»; «Гран-пры вельмі неспадзяванае» (далей стаіць эмодзі, што азначае смех). Натуральна, гэта не ўсе заўвагі да вынікаў, якія абвясцілі 4 ліпеня, але менавіта пералічаныя перадаюць агульны настрой.

Гран-пры гэтым разам ў Зоі Літвінавай і Алесі Скарабагатай. Выбар гледачоў і журы падаецца заканамернай з'явай. Непадобныя аўтары розных пакаленняў прыцягваюць святлом, якое вылучаюць іх карціны. Справа не толькі ў бездакорным валоданні тэхнікамі, у якіх працуюць мастачкі, але ва ўменні перадаць унутранае, душэўнае святло, жаданні ім падзяліцца. З іншага боку, на стаўленне аўдыторыі маглі паўплываць таксама зусім празаічныя прычыны. Напрыклад, кідаецца ў вочы адна асаблівасць размяшчэння іх карцін у маштабнай экспазіцыі — гэта ключавыя прасторы галерэй Палаца мастацтва. Да таго ж немагчыма не звярнуць увагу на колькасць палотнаў. Усё ж многія аўтары прадстаўлены 1—3 работамі, а творчасць Зоі Літвінавай і Алесі Скарабагатай прэзентуецца значна шырэй. Зрэшты, відавочна адно — публіка выбірае дасканаласць.

Што тычыцца намінацый, то тут амаль без сюрпрызаў: найлепшымі сталі тыя, каго аматары мастацтва палюбілі нашмат раней, хто даўно заявіў пра сябе на выстаўках і фестывалях. Пераважна гэта маладыя мастакі, але гледачы не пакінулі без увагі і карыфеяў. Так, у намінацыі «Жывапіс» лідары наступныя: Маргарыта Маніс (пра яе выстаўку, прысвечаную Мінску, мы ўжо згадвалі раней, але на галоўнай пляцоўцы яна прадставіла работы іншых кірункаў), *Kate Shi*, Наталля Ліпская, Фёдар Бажын і Глорыя Ран. У намінацыі «Графіка» перамаглі



Kate Shi «821», 2023 г.

Валерый Славук, Усевалад Швайба, Ганна Кохан, Фёдар Шурмялёў, Марыя Сыракваш. Што тычыцца «Скульптуры», то тут гледачы выбралі Андрэя Беле, Кірыла Сікорскага, *A. Nich*, Юрыя Пеўнева і Ірыну Рамбальскую. У намінацыя «Інсталяцыя» найлепшымі, на думку гледачоў, сталі Яна Волкава, Паліна Корзун-Фомчанка і Алёна Сінкевіч, Ірына Котава, *Palirina*, а таксама Мар'яна Карповіч. Дарэчы, сёлета паўдзельнічала даволі шмат фотамастакоў. Публіцы прыйшліся да спадобы работы Кірыла Смалякова, Міхаэля Закашанскага, Ксеніі Лакоткі, Валерыя Неўмяржыцкага і Андрэя Семянкова. Як заўсёды, нетрывіяльна падыходзяць да справы майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У аднайменнай намінацыі перамаглі Андрэй Церахаў, Людміла Землякова, Юрый Дубоўскі, Юлія Цярэшка, Алена Хаценка.

Хочацца верыць, што «Арт-Мінск» будзе толькі пашыраць межы. Верагодна, многія з мастакоў не змаглі трапіць на фестываль — тут і конкурс, і абмежаванасць любой выставачнай прасторы… Але калі параўнаць фэст нават з мінулагоднім, прыходзіш да высновы, што арганізатары працуюць над фарматам, імкнуцца зрабіць праект болей дэмакратычным. Галоўная задача пры гэтым не змяняецца — выбіраць аўтараў розных кірункаў, каб зацікавіць гледача і паглыбіць яго веды пра сучаснае айчыннае мастацтва.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

І сціпла, і з размахам

Прызначэнне твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва — дэманстрацыя. Гэта работы не для камерных выставак і прыватных калекцый; яны ствараюцца для вялікіх залаў, для шырокай прасторы, фарміруюць асяроддзе. Такое мастацтва арыентуецца на масавага гледача і імкнецца ўздзейнічаць на яго эмоцыі і думкі. Не адыходзіць ад законаў і манументальнае мастацтва Беларусі, якое апошнія гады гучна пра сябе заяўляе: распісваюцца храмы, аздабляюцца прыватныя інтэр'еры, упрыгожваюцца грамадскія памяшканні, рэстаўрыруюцца гістарычныя помнікі. Для знаёмства з апошнімі дасягненнямі ў гэтым напрамку запрашаюць у Палац мастацтва. Праект працягнецца да 16 ліпеня.

Крыху загадак

На мінулым тыдні пачала работу рэспубліканская выстаўка манументальнага мастацтва «Манумент-23». Сталічнаму гледачу праект знаёмы: у 2021 годзе праводзіўся фестываль манументальнага мастацтва, задуманы як маштабны выставачны марафон. Тады ён аб'яднаў мастакоў-манументалістаў з Мінска і розных рэгіёнаў краіны. Мэтай фэсту, які праходзіў, дарэчы, на розных арт-пляцоўках сталіцы, было пазнаёміць з тэндэнцыямі ў сучасным беларускім манументальна-дэкаратыўным мастацтве, прадставіць шырокай публіцы вядомых аўтараў і іх новыя работы, выкананыя ў розных жанрах і матэрыялах. Да таго ж імкнуліся адкрыць імёны маладых мастакоў, у тым ліку студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў: для некаторых выстаўка ў рамках фестывалю стала першай рэспубліканскай.

Нягледзячы на тое, што на сёлетняй афішы ёсць пазначэнне «рэспубліканскі фестываль манументальнага мастацтва», «Манумент-23» — гэта ўсё ж такі выстаўка. Прычым даволі сціплая — яна займае толькі другі паверх галерэі «Палац мастацтва». Пакуль больш нічым Беларускі саюз мастакоў, які выступае арганізатарам, не парадаваў.

Прыкладна палова выстаўкі расказвае пра дзейнасць Мастацкага камбіната Беларускага саюза мастакоў. У свой час камбінат займаўся афармленнем знакавых

Таццяна Савік «Паветра», 2020 г.

будынкаў Беларусі (Палац Рэспублікі, Палац Незалежнасці, Дзелавы і культурны комплекс Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі; удзельнічаў у афармленні будынкаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і іншых). Так, экспазіцыя дазваляе даведацца пра розныя кірункі дзейнасці Мастацкага камбіната: тут вядзецца гаворка пра графічную, керамічную, вітражную і вышывальную майстэрні. На жаль, многія работы прапаноўваюцца гледачу як прыклады, без пазначэння аўтарства, назвы праекта і яго прызначэння. У гэтым выпадку дэманстрацыя поспехаў атрымалася не вельмі прэзентабельная, хапае не патрэбных шырокаму гледачу загадак. Натуральна, ухіл быў на іншае, але…

Найбольш змястоўнай выглядае частка выстаўкі, якая знаёміць з работамі, выкананымі ў мемарыяльным комплексе «Хатынь». Гэта прэзентацыя таго, як сёння выглядае экспазіцыя адмысловага музея;



Юлія Цярэшка «Метафізічная галава», 2023 г.

невялічкая экскурсія, дзякуючы якой расстаўляюцца акцэнты і даюцца адказы на пытанні «як», «чаму» і «навошта». Новы музей адкрыўся 22 сакавіка гэтага года, таму ацаніць яго канцэпцыю паспелі далёка не ўсе.

Манументальнае і камернае

Сярод аўтараў, творы якіх трапілі на выстаўку «Манумент-23», — Уладзімір Крываблоцкі, Каміль Камал, Уладзімір Кандрусевіч, Антон Шапо, Таццяна Савік, Канстанцін Андруковіч, Фёдар Драгун і іншыя. Як адзначаюць арганізатары, прадстаўнікі секцыі манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускага саюза мастакоў не толькі працягваюць найлепшыя традыцыі айчыннай манументальнай школы, але і актыўна дэманструюць сучасныя погляды на мастацтва і ўласную творчую індывідуальнасць. У БСМ упэўнены, што ўдзельнікі выстаўкі даюць магчымасць паглядзець на класічны від мастацтва з іншага ракурсу, бо па-майстэрску пераасэнсоўваюць класічныя тэхнікі (напрыклад, ляўкаса, мазаікі, фрэскі, вітража) і ствараюць новую і сучасную мастацкую мову. Калі казаць пра найбольш удалыя эксперыменты, то найперш хочацца згадаць творы Лізаветы Савіч і Юліі Цярэшкі. Маладыя мастачкі эксперыментуюць у тэхніцы мазаікі, а іх творчыя пошукі скіраваны на пачуцці асобнага чалавека. Аўтары даследуюць асаблівасці яго душэўнага стану, атаясамліваюць сябе з тым ці іншым героем. У гэтым прасочваецца цікавая сувязь манументальнага і камернага.

Вядома, што творы манументальнага мастацтва звычайна ўвекавечваюць выдатных дзеячаў, значныя гістарычныя падзеі. Між тым тэматыка і стылістычная накіраванасць заўсёды залежаць ад атмасферы, якая пануе ў грамадстве. Пасля знаёмства з выстаўкай «Манумент-23» адказаць на пытанне аб тым, на што скіраваны думкі вялікай колькасці беларусаў, адназначна складана. Справа ў тым, што відавочных або зашыфраваных кодаў, агульных для большасці работ, не так шмат. Прысутныя (лепей сказаць — знойдзеныя) галоўным чынам тычацца нацыянальных традыцый. Гэта і яркі жывапіс Сяргея Бышнёва, і пяшчотная кераміка Анастасіі Чадзій, і вытанчаная скульптура Мікалая Барбарчыка… Традыцыйна мастакі звяртаюцца і да сусветнай мастацкай спадчыны, аднак тут варта абысціся без прыкладаў і каментарыяў. Цікавей шукаць гэтыя сувязі самому.

Неспадзяваныя апаненты

Нечакана, але ў адносна невялікай экспазіцыі арганізатарам удалося завастрыць увагу гледача на двух асобных аўтарах. Першы — Уладзімір Крываблоцкі, асновай творчасці якога з'яўляецца мінулае Беларусі, асаблівасці краіны. На выстаўцы дэманструюцца фотаздымак пано «Дрэва жыцця» (1994), якое аздабляе шматпавярховік у Светлагорску, эскіз мазаікі для Палаца культуры Кобрына «Зямля роднага краю» (1982), трыптых «Галгофа Трасцянца» (1983), палотны «Вока Чарнобыля» (1986) і «Таемная Вячэра» (2022). Уладзімір Крываблоцкі выступае яркім прадстаўніком чыстага манументальнага мастацтва — ён прыхільнік «высокага стылю», маштабнага мыслення. Яго творы немагчыма абысці ўвагай па дзвюх прычынах. Першая: яны маюць вялізны памер і нават у адмысловым выставачным праекце вылучаюцца размахам. Па-другое, здзіўляе зварот да творчасці гэтага мастака — усё ж большасць прадстаўленых работ створана даволі даўно і добра вядома гледачу. Верагодна, гэта даніна павагі. Уладзімір Крываблоцкі — знакавая асоба ў манументальным мастацтве Беларусі і некалі ўзначальваў секцыю манументальна-дэкаратыўнага мастацтва БСМ.

Другі творца, якога знарок вылучылі арганізатары, — Таццяна Савік, пастаянная ўдзельніца рэспубліканскіх і міжнародных выставак. Калі папярэдні аўтар асэнсоўвае мінулае, сістэматызуе назапашанае, збірае

Лізавета Савіч «Какет», 2023 г.

разам аскепкі розных светаў, то маладая мастачка, якая прадставіла для выстаўкі вельмі шмат кампазіцый, наадварот, разбурае і ставіць пад пытанне часцяком уяўную цэласнасць. Гаворка найперш пра ўнутраны свет асобы, але хто ведае — жыццё, такое хісткае, магчыма, мае патрэбу ў рэформах і пераўтварэннях. Метад — на выбар гледача.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара



Антон Шапо «Антарктыда» (з серыі «Часткі Свету»), 2016 г.

Андрэй Кальга «Пачвара», 2023 г.

Каміль Камал. З серыі «Усход», 1994 г.

«Ты ў свет прыйшоў не дзеля разбурэння...»

На знаёмства з узбекскім паэтам

«…А піяла не думае спыніцца»… Сіражыддзін Саід — паэт-філосаф. Хаця, які сапраўдны паэт не філосаф?!. Вельмі часта ў паэтычным пошуку творца становіцца празорлівым, здольным разгледзець будучыню. Здараецца, што і далёкую ад нас па часе. У мяне было некалькі сустрэч з добра вядомым ва Узбекістане, у суседніх краінах Азіі, ды і ў іншых куточках свету таксама, паэтам, перакладчыкам, публіцыстам Сіражыддзінам Саідам. Сустракаліся мы і ў Беларусі, калі ў 2018 годзе пісьменнік прыязджаў на Дзень беларускага пісьменства, удзельнічаў у міжнародным круглым стале літаратараў «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго». Свята праходзіла ў Іванаве. Дыскусіі паэтаў, празаікаў, перакладчыкаў адбываліся напярэдадні — у Варацэвічах, у музеі Напалеона Орды. Тады творца прывёз у Беларусь новую кнігу перакладаў паэзіі Якуба Коласа на ўзбекскую мову. А пасля ў 2019 годзе старшыня Саюза пісьменнікаў Узбекістана наведаўся ў Мінск на круглы стол «Сучасныя беларуска-ўзбекскія літаратурныя сувязі», які прайшоў у Купалаўскім музеі.

Настрой паэзіі нашчадка Алішэра Наваі і Гафура Гуляма, скіраваны на несупыннае развіццё, на цвёрдасць чалавека ва ўтрыманні незацуглянага Сусвету, перадаецца з вершаў на жыццёвыя, паўсядзённыя клопаты Сіражыддзіна Саіда. Ён надзіва паслядоўны ў сваіх прыхільнасцях да Беларусі. Вось і варта было толькі зрабіць напрыканцы мінулага года ў Ташкенце прапанову наладзіць сустрэчу ў Мінску, як і сам кіраўнік творчай арганізацыі, і яго калегі паабяцалі правесці ў Мінску Дні ўзбекскай літаратуры ў Беларусі. І ўжо ў сёлетнім сакавіку былі паэтычныя вечарыны, сустрэчы ў бібліятэках, круглыя сталы ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі, у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. Поруч гучалі беларуская і ўзбекская мовы. Дзве плыні, дзве моўныя стыхіі, яднанне арыгінала і яго пераўвасаблення ў публікацыі перакладаў вершаў Сіражыддзіна Саіда — і ў сённяшнім нумары «Літаратуры і мастацтва». І адбылося гэта дзякуючы і падрыхтоўчай працы рускага паэта Мікалая Ільіна, які жыве і працуе ў Ташкенце, які ведае паэзію нашага ўзбекскага сябра ў арыгінале, і, зразумела, дзякуючы шаноўнаму беларускаму перакладчыку Андрэю Цяўлоўскаму. Будзем спадзявацца на працяг такой увагі. Як і на працяг беларуска-ўзбекскай літаратурнай дружбы.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Сіражыддзін САІД

Закінуты кішлак

Тут нябёсы надтрэснуты,
плынь пасівела вады.
Паваліліся, згніўшы,
слупы пры верандах пустых.
Разышліся аглоблі разбітай,
нічыйнай арбы,
Скіраваны ў Сусвет,
яе позірк здзіўлёна застыў.

Твары тут адсырэлі, бы тыя сырыя дамы,
Каліграф нераможны іх скрухі
пячаткай размыў.
А над дахамі месяц
дрыготкі стамлёна вісіць,
Адзінока пажоўк,
нібы ў познюю восень лісты.

Тут таполі, бы згаслыя свечкі, —
спынілася фарбаў гульня —
У маленні галіны дарма
намагаюцца ўзняць.
Ачагі, вінаграднікі, вербы, тандыры — усе
Як адзін беспрытульныя ў свеце
суцэльнай брыды.

Дык па што я прыйшоў сюды?
Пэўна, адчуў неяк я,
Што душу мне жывую судзіла
вось гэта зямля.
Лістапад асляпляе празрыстыя
вочы крыніц,
Паразбегліся сцежкі, забыўшы,
ім весці куды.

Як сіроты, жалобна счарнелыя вокны
глядзяць,
А ў бязлюдных садах,
што на схілах самотных стаяць,
Адзінокі, працяты бясконцай тугой,
Вецер лёсу майго безнадзейна
шукае сляды.

* * *

Вясна, вясна! Так гучна і нястрымна
Ад родных гор тваё я чую слова.
Пра новыя калыскі гавары мне,
Не гавары мне аб магілах новых.

* * *

Змяшаліся сон і смерць,
Змяшаліся свет і журба.
З'ядналіся сон і стогн,
Маленне і барацьба.

Змяшаліся неба й дол,
З'ядналіся дол і час,
У белага — чорны скол,
Лякарства з хваробай ураз.

Зліліся вясна і зіма,
На снезе крывёй бутон:
Росквіт — і разам снег,
Між квецені — зграя варон.

Як вырак жыцця ўсяго,
Зліліся святло і змрок:
Світанак цвіце чарнатой,
А ў цемры — святла выток.

Каханне разлукай баліць.
Што кажа нам знак нябёс?
Я сутнасць людзей тваіх
Спазнаць не магу, о лёс!

Пасланне да цябе

Змаганне вядзём за зямлю і ваду,
За неба і месяц заўжды ў барацьбе,
І кожны яшчэ намагаецца тут
Уласнае крэсла здабыць для сябе.

Ды шчырасць сапраўдная ў іншым, аднак:
Пачцівасць і праведнасць толькі ў цане,
Калі шанавання апошняга знак
Спяшаюцца целу аддаць у труне.

Ты гэта ўсё ў памяць сваю занатуй —
Калісьці пазней асэнсуеш спаўна,
Чым вабныя крэсла нам так і труна,
І ўласны свой шлях адпаведна рыхтуй.

Чалавек

Ты прагнеш разбурыць усё дазвання,
Чарнее ценем зброя на Каране.
Адкуль і кім пасланы ты сюды?
І хто з нас, адкажы мне, мусульманін?

І ты, што твар крыжом свой асяніў,
Чаму чужыя пляжыш карані?
Стваламі пагражаючы бязвінным,
Хто з вас, скажы, сапраўдны славянін?

Няма ў зла нацый. І няма душы.
Не вернік той, хто д'яблу мкне служыць.
Спазнанне гэтай ісціны спрадвечнай
Паўсюль паўмесяцы вянчаюць і крыжы.

Ты ў свет прыйшоў не дзеля разбурэння,
Не помсце вызначаць твае памкненні.
Для дабрыні стварыў цябе Ўсявышні —
Дык веру праяві сваю стварэннем.

Два малюнкі

Свет быў заўжды такі,
што б мы ні меркавалі,
Вось гэты мае ўсё, а тыя лёс не хваляць.
Заўжды былі ў самоце салаўі,
Заўжды вароны смецце разграбалі.

* * *

Шкадуеш вятроў, што далоў адляцелі,
Застацца з табою навек не схацелі?
Пачуцці твае ад удараў трымцелі —
Ты ўся як руіна — табе не паўстаць.

Мой свет — бы спусцелы палац,
дзе спрадвеку
Гучыць даўняй музыкі смутнае рэха.
Катуй жа душу мне, палі яе здзекам —
Без болю той музыкі мне не чуваць.

Ты — нітка караляў у пальчыках ночы,
Рубінамі іх твая палкасць клякоча,
Калі мы з табой бы змяіны клубочак —
І з гэтым не здольная ты саўладаць.

Мая душа

Душа захварэла, і ясна адчулася мне,
Як згусткі крыві ў ёй сабраліся недзе на дне.
За дзень адбылося яно, ці мо занач у сне?
Ды горы, расплыўшыся,
зніклі ў чужой старане,
І толькі туман заміж іх над маёй галавой.
На ніцых галінах жывое лісцё
не трымціць,
Адна толькі зорка між імі
самотна мігціць.
Разлазіцца неба па швах,
лёсу страціўшы ніць.
Кахання майго горкі попел
па ветры ляціць,
І цэлы сусвет стаў бяднейшым
ад страты маёй.

Няверных ці варта дарма
прыгажунь шанаваць?
Адна — кіпарыс,
тую можна з вярбой параўнаць,
З бярозкаю — трэцюю.
Што ад гарэзніц чакаць?
Ад часу, як свет распачаў
на мяне паляваць,
Напяліся бровы дзяўчын тых,
бы лук са стралой.

А цела з душой між сабой падзялілі мяне,
І толькі па іх я пакутую сёння віне.
Слёз горкіх струмень замінае радкам
палымнець,
Я проста не існы, не той,
што быў з вамі раней,
І квецень надзей маіх мараю звяла пустой.

Душа захварэла. І што за бяда, за туга?
Чаму гэты боль так раптоўна мяне
напаткаў?
Яшчэ ж маладосць,
шчэ на сілы не час наракаць…

Вось свята для тых,
хто так жорстка мяне падсякаў,
І гора для тых,
хто ў мяне ўсёй паверыў душой.

Круціцца піяла

Па коле — піяла, па коле час імчыцца,
Здзяйсняюць зоркі вечны круг,
бы ў коле спіцы.
Няма ўжо многіх на жыцця
банкеце шумным,
А піяла не думае спыніцца…

Коннікі

Я згадваю дзяцінства. Ноч і восень.
Равеснікі даўно ўжо бачаць сны.
А ў нашай хаце спозненыя госці
Пра коней не сцішаюць гаманы.

О, як яны захоплена, з азартам
Да коней тых выказваюць любоў!
Хіба што ў гэтым свеце болей варта
Такіх прачулых і гарачых слоў?

І я, хлапчук, бы чую ў іх гамонцы
Гудзенне ў травах стэпавых вятроў,
І тупат капытоў, і рух бясконцы,
І хрып, і ржанне вольных табуноў.

Зіма прайшла пад гэткія размовы.
Прачнуўся неяк раз — гасцей няма.
І ў хаце быццам пуста стала знову,
І коней на двары шукаць дарма.
І неба апранулася сінечай,
І дзесь на ўзгорках роднай стараны
Гул трактара збудзіў палёў пустэчу
Прадвесцем надыходзячай вясны.

Чагоніён*

Кумган,
Кумган,
Поўны пяском кумган,
Сыплюцца трэснутымі чарапкамі вякі.
Тут не сустрэнецца аніводны курган.
Курган,
Курган,
Поўны пяском курган.
Сплываюць,
нібы вада,
у прагны пясок радкі:
«Каму ўзворваць краю майго дзірван?»

Радзімка

На ціхай паляне вярба адзінока стаіць,
На ніцай галіне задумлівы месяц сядзіць.
Патрапіўшы так нечакана ў кахання сіло,
Жыццё мне ў далоні знясіленай
птушкай ляціць.
Ды, думкі пра птушку пакінуўшы,
страціўся я:
Так міла між кудзераў вабіць
радзімка твая…

Кранаючы бровы гарэзлівай мяккай рукой,
Абмыўшы прыгожыя шчокі
слязой трапяткой,
Сярод валасоў,
што ліюцца на плечы ракой,
Заблытаўся вецер,
гатовы ў світанак сысці.
Ды, думкі пра вецер пакінуўшы,
страціўся я:
Так міла між кудзераў вабіць
радзімка твая…

Бы ўсходы начныя, дрыготкія вейкі твае.
Душа з неба зорнага вільгаць
крынічную п'е —
Паўнюткая чаша,
праз край захапленне ліе.
Гадзіна дзівосаў спавіла аціхлы сусвет,
І сум нечаканы адбіў у душы маёй след.
Ды, думкі аб суме адкінуўшы, страціўся я:
Так міла між кудзераў вабіць
радзімка твая…

На жаль, мы з табою не здолелі
лёсы злучыць
І нашыя зоркі ў сузор'е адзінае зліць,
Мы нават радзімку тваю не змаглі
падзяліць.
Ды недзе ў глыбінях збалелай душы
ўсё адно,
Гатовая цэлы сусвет для яе засланіць,
Самоціцца думка,
што мне не пазбыць аніяк:
Так міла між кудзераў вабіць
радзімка твая…

З узбекскай.
Пераклад Андрэя ЦЯЎЛОЎСКАГА

---

*Чагоніён — старажытная назва мясцовасці ў Цэнтральна-Азіяцкім рэгіёне.

З каранёўскага бяздоннага калодзежа

Імя пісьменніка Анатоля Данільчанкі ў 1980-я гг. было добра знаёма педагагічнаму калектыву школы, што ў пасёлку Каранёўка Гомельскага раёна. Пра свайго сына з гонарам і любоўю распавядала калегам яго маці Ніна Георгіеўна — настаўніца пачатковых класаў.

Анатоль Данільчанка.

Ганарыцца было чым. Не ў кожнай сын — пісьменнік. Сведчаннем гэтаму быў раман «Люди живут семьями» пра падзеі, што адбываліся ў час Вялікай Айчыннай вайны на Гомельшчыне, у тым ліку і ў Каранёўцы.

Нарадзіўся будучы пісьменнік у 1940 г. у невялікім пасёлку Граза Гомельскага раёна ў сям'і настаўнікаў. Рана застаўшыся без бацькі, які загінуў у 1944 годзе пад Варшавай, ён хлопчыкам, а потым падлеткам зведаў горыч сіроцтва і паслявае нна нястачы. У сямнаццаць гадоў пайшоў працаваць на завод сельскагаспадарчых машын «Гомсельмаш». Потым па камсамольскай пуцёўцы праходзіў працоўную загартоўку на шахтах Данбаса. Затым, пасля вайсковай службы, зноў «Гомсельмаш». Гэтым разам малады чалавек сумяшчаў працу электрагазазваршчыка з літаратурнай: быў пазаштатным карэспандэнтам газеты «Гомельская праўда» і друкаваў свае творы, пераважна вершы, у заводскай шматтыражцы.

Такая школа жыцця загартавала яго і дала багаты матэрыял для будучых вершаў і прозы. У Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага ён прыйшоў з выразна вызначанымі поглядамі і немалым жыццёвым вопытам.

Анатоль паступіў на вучобу як паэт. Яго літаратурным настаўнікам стаў Яўгеній Далматоўскі, які потым доўгія гады заставаўся і старэйшым сябрам. У хуткім часе малады пісьменнік зразумеў, што яго прызванне — проза. У якасці дыпломнай работы ён прадставіў раман «Людзі жывуць сем'ямі», які пазней назваў галоўнай кнігай свайго жыцця.

Па заканчэнні інстытута Анатоля Данільчанку накіравалі ў Валгаград — з таго часу пастаяннае месца пражывання яго сям'і. Там пабачылі свет усе наступныя творы пісьменніка — раманы «Паціна», «Восеньскія туманы», дзевяць аб'ёмных аповесцей, апавяданні, нарысы, вершы. Пяць тамоў прозы прывёз беларускай радні сын пісьменніка Алег Анатольевіч, які нядаўна наведаў бацькаву і сваю малую радзіму.

Для радні пісьменніка і каранёўскіх аматараў чытання прывезеныя сынам пісьменніка кнігі — гэта новая (пасля рамана «Людзі жывуць сем'ямі») сустрэча з творчасцю земляка, дзе арыгінальныя сюжэты, а галоўнае, глыбокая думка, якая, не засланяючы падзей, у выніку выступае на першы план. Бо праблемы яго герояў — агульначалавечыя.

Станоўчыя героі прозы Анатоля Данільчанкі з'яўляюцца, несумненна, выразнікамі асабістых поглядаў аўтара. Важнае месца займае тэма непарыўнага адзінства чалавека і прыроды. Жыццё яго станоўчых герояў — гэта прыклад таго, як у цяжкіх умовах набіраецца сілы і сталее сапраўдны чалавек.

Пісьменнік дасканала ведае тое, пра што піша ў кожным сваім творы. І ведае не па чутках. Усе дэталі ў яго рэалістычныя: апісанні — яркія, аб'ёмныя, дакладныя; разважанні — і аўтарскія, і ў вуснах герояў — народжаны ў выніку сур'ёзнай работы думкі. Калі гэта дыялогі, то яны натуральныя, без пустых фраз, без нацяжак і фальшу. Гэтаму верыш, нібы ўбачанаму на ўласныя вочы. А прачытаўшы твор, не спяшаешся ўзяцца за другі, бо знаёмыя персанажы і іх думкі ўсё яшчэ з табою.

Анатолій Данільчанка большую частку жыцця пражыў у Расіі і пісаў на рускай мове. Але сюжэты сваіх твораў браў з беларускай рэчаіснасці. Яго творчасць — нагляднае пацвярджэнне думкі Таццяны Мушынскай: «Успаміны дзяцінства — бяздонны калодзеж, з якога чалавек чэрпае потым усё наступнае жыццё».

І сапраўды, варта толькі прачытаць слова «ўнучак» — і адразу становіцца зразумелым, што падзеі адбываюцца ў Беларусі. «Унучкам» называюць героя рамана «Людзі жывуць сем'ямі» бабка Аксіння і дзед Савелій. Імёны не прыдуманыя, так звалі дзеда і бабку пісьменніка.

У аўтабіяграфічнай аповесці «Андрейкина война» («Андрэйкава вайна») сустракаем тапонімы Гомельшчыны, у тым ліку і Гомельскага раёна: Добруш, Зябраўка, Саколка. Кожны жыхар пасёлка Каранёўка, прачытаўшы гэтую аповесць, у апісанні мясцовасці, дзе жывуць Андрэйка з мамаю, пазнае свой пасёлак. Гэта не выпадкова. Менавіта ў Каранёўцы, у цагляным бараку, які, ужо напаўразбураны, знеслі толькі ці не тры гады таму, жыў пасля вайны са сваёй маці і вучыўся ў тады яшчэ пачатковай (цяпер базавай) школе будучы пісьменнік.

Або завод у аповесці «Адзін на адзін». У апісанні працы галоўнага героя на заводзе, безумоўна, выкарыстаны ўспаміны аўтара пра гады яго работы на «Гомсельмашы». А куточкі горада, што згадваюцца ў рамане «Восеньскія туманы», прыйшлі туды таксама з гомельскага юнацтва.

Трагічны выпадак раптоўна абарваў жыццё пісьменніка. Яму было толькі шэсцьдзесят адзін. Сваю смерць ён прадказаў амаль дакументальна:

Я умру в одночасье —
Только глазом моргнуть.
И от светлого счастья
Переполнится грудь.
Я уйду, улыбаясь,
От земного житья.
Не простясь, не покаясь,
Знать, такая статья.
Я покаюсь на небе
Средь густой синевы.
То ли был, то ли не был —
Это скажете вы.

«Вядома, быў. І ёсць», — скажуць чытачы яго кніг, у тым ліку і беларускія, многіх з якіх, спадзяюся, яшчэ чакае знаёмства з творамі земляка — расійскага пісьменніка-беларуса.

Галіна РАГАВАЯ

«Выжываюць самыя бязглуздыя ідэі»

Ён заседжваўся з намі да позняй ночы. Тлумачыў, паказваў, рабіў разам з намі, рабіў за нас… Вельмі шмат працаваў… Усё ў яго маленькім пакойчыку ў корпусе Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта пахла цыгарэтным дымам і кавай. Гэта ўпісвалася ў класічны вобраз адданага працы інтэлігента, але цяпер думаецца: калі б не цыгарэты, можа, сёлета мы віншавалі б яго з 75-годдзем?..

Яўхім Леанідавіч Шур нарадзіўся 8 чэрвеня 1948 г. у Чавусах. У 1966 годзе паступіў на факультэт журналістыкі, з гэтай прафесіяй і звязаў усё жыццё. Вярнуўшыся з войска, пайшоў працаваць у мінскі часопіс «Рабочая смена», а пасля ўзначаліў яго публіцыстычны аддзел, пісаў пра спорт. Дзякуючы камандзе журналістаў-энтузіястаў «Рабочая смена» з малатыражкі камітэта прафтэхадукацыі перарасла ў сур'ёзны маладзёжны часопіс, які публікаваў цікавыя пераклады замежных аўтараў, публіцыстыку і тэксты савецкіх пісьменнікаў-пачаткоўцаў. Працуючы рэдактарам, Яўхім Леанідавіч выпусціў кнігу «Клічу ў сваю прафесію» (1987), прысвечаную розным заняткам.

У 1988 г. «Рабочая смена» была перайменавана ў «Парус». На той момант беларускі часопіс ужо быў усесаюзна вядомым, стаўшы флагманскім лайф-стайл выданнем для маладога пакалення перыяду перабудовы. Тыражы дасягалі мільёна асобнікаў, у часопісе ўпершыню (у шырокім друку) з'явіліся станоўчыя матэрыялы пра савецкую рок-сцэну, а на апошняй старонцы друкаваліся вокладкі для касет рок-гуртоў. У той час, калі музыка перапісвалася на хатніх магнітафонах, упрыгожыць безназоўную касету стыльнай вокладкай, ды яшчэ з інфармацыяй пра гурт, было вельмі крута.

Аднак «Парус» не страчваў літаратурнай накіраванасці. Тэматычныя нумары, прысвечаныя фантастыцы, — сёмыя. Асабліва цікавыя «сямёркі» 1988 і 1989 гг. На старонках часопіса набывалі вядомасць такія значныя імёны беларускай фантастыкі, як Сяргей Булыга, Юрый Брайдэр, Мікалай Чадовіч і іншыя. У далейшым фантастычны кірунак перарос у асобнае выданне — часопіс «Фантакрым MEGA» (1991—1998) з нязменным рэдактарам Я. Шурам. У 1994 г. Яўхіма Леанідавіча ўзнагародзілі прэміяй «Странник», якую ўручаў сам Барыс Стругацкі.

Яўхім Шур.

Акрамя таго, у 1990—1991 гг. Я. Шур працаваў у рэдакцыі часопіса «Дело». Потым узначальваў выдавецтва «Петыт», быў дырэктарам невялікага выдавецтва з гучным імем — выдавецкі дом «Огонек» у Маскве. Пісаў пад псеўданімам Ш. Яфімаў, а пазней — Серафіма Кобыша. Жыў у Мінску, пазней у Маскве. Жонка Галіна — кіназнаўца, сын Эрык — маскоўскі журналіст.

У канцы 1990-х мы былі студэнтамі, біёлагамі і фізікамі — нават не журналістамі ці філолагамі. Але вельмі хацелі зрабіць беларускамоўны альманах фантастыкі, хаця нічога не разумелі ні ў рэдактуры, ні ў паліграфіі, ні тым больш у бізнес-працэсах. А ён, Яўхім Шур, быў вядомым на ўвесь былы Саюз журналістам, рэдактарам, лаўрэатам прэміі з велізарным досведам. Ці разумеў ён, што ў нас, верагодней за ўсё, нічога не атрымаецца? Вядома, разумеў. Нават яго дзецішча «Фантакрым *MEGA*» з напрацаванай аўдыторыяй і рэпутацыяй ужо выдыхаўся. І ён нам казаў пра гэта, але нязменна дадаваў: «Выжываюць самыя бязглуздыя ідэі».

І зноў дапамагаў, рабіў вёрстку, паказваў, тлумачыў. Без усялякай уласнай выгады. Проста дзеля таго, каб чарговая «бязглуздая ідэя» выжыла ці, можа, са спагады да нас, маладых… Мы цанілі гэта, але толькі цяпер разумеем маштаб асобы Настаўніка. Яго чакала дома сям'я, ён заставаўся запатрабаваным журналістам, меў іншыя праекты, але нязменна выкройваў час для нас і нашых «бязглуздых ідэй». Час, якога ў яго заставалася так мала… Я. Шур змагаўся з цяжкай хваробай. Дзве аперацыі, цяжкія хіміятэрапіі. Сябры сведчылі, што ён не здаваўся, стараўся падтрымліваць блізкіх і да апошняга дня пісаў, пры любой магчымасці сядаў за камп'ютар.

…Яўхіма Шура не стала ў 2013 годзе. Застаецца памяць. Памяць пра добрага і светлага чалавека — аднаго з тых, дзякуючы каму выжываюць «бязглуздыя ідэі». Выжываюць — і надаюць нашаму жыццю новыя фарбы.

Алесь СПІЦЫН

Кветка з літпалетка

Расліна, якую не возьмеш голымі рукамі

Ёсць на айчынных палетках такія расліны, якія ў літаральным сэнсе гэтага слова голымі рукамі не возьмеш, — няхай яны не могуць вылезці з глебы і змяніць дыслакацыю ў выпадку небяспекі, але, тым не менш, здольныя пастаяць за сябе і абараніць сваю недатыкальнасць. Напрыклад, крапіва. Яна лічыцца пустазеллем, шырока распаўсюджана на Беларусі. Не здзіўляе, што здаўна мае сталую прапіску не толькі ў літаратуры, але і ў фальклоры, і ў старажытных магічных абрадах нашых продкаў.

Калі казаць пра гісторыю літаратуры, найперш згадваецца наш славуты сатырык Кандрат Крапіва (1896—1991) (сапраўднае імя Кандрат Атраховіч). Сатыра — від слоўнай зброі, і подпіс Крапіва пад сатырычнымі творамі вельмі дарэчы і да месца. «Крапіва» была і назвай яго другой па ліку кнігі сатыры і гумару (1925, перавыданне ў 1932 годзе). Адна з гумарыстычных кніг Крапівы называлася «Пучок жыгучкі» (1973). Слова «жыгучка» — лексічная адзінка нашай безэквівалентнай лексікі, на рускую мову перакладаецца двума словамі — «жгучая крапива». Імя Кандрата Крапівы нададзена Уздзенскай сярэдняй школе № 2, у сценах якой працуе музей пісьменніка, дзе захоўваюцца арыгіналы яго твораў, дакументы, фотаздымкі, асабістыя рэчы. Не толькі аматарам творчасці Крапівы цікавы экскурсіі па музейнай экспазіцыі: краязнаўчы і этнаграфічны складнік работы ўстановы таксама з'яўляецца яе гонарам і прывабліве неабыякавых да гісторыі роднага краю, малой радзімы.

Часта вобраз крапівы сустракаецца ў творах для апісання закінутасці і занядбанасці. Так, у баладзе «Шыбініца» Янкі Сіпакова канстатуецца:

Фота Змітра Кузменкі.

Крапіва двудомная.

Вось так цэлы край узялі і забілі
І вырвалі мову з глытніцы жывой,
І памяць забралі, каб казкі і былі
Навек зараслі бадыллём, крапівой.

Падобная карціна і ў вершы Віктара Худаўца «Расце крапіва»:

Расце крапіва каля тыну старога.
Няма у двары ўжо болей нікога.
І кажа яна: «Паважаны мой тыне!
Я цяпер тут адна гаспадыня».
<…>
Сярод крапівы стаіць госцяй жанчына,
Шчаку выцірае раз-пораз хусцінай.
І каб не было так на сэрцы тужліва,
У беленькі колер убралася сліва.

Крапіва — часты госць і ў народных спевах. Так, яе згадка ў адной са жніўных песень (дзе яскрава і з гумарам паказана стаўленне нявесткі да свекрыві, заснаванае, відаць, на непаразуменнях, паміж імі) можа і рассмяшыць:

У мяне дома бяда стала —
Свякроўка ў крапіву ўпала.
Не шкада свякровачкі,
А шкада крапівачкі:
Свякровачка сама ўстане,
А крапівачка павяне.

Нашы продкі верылі, што крапіва ахоўвае ад нячыстай сілы. У казках распаўсюджаны сюжэт, як сястра выратоўвае ператвораных у лебедзяў братоў, зрабіўшы ім кашулі з крапівы. Існуе паданне, што ў крапіву ператвараліся кімсьці праклятыя людзі, і расла крапіва там, дзе хтосьці загінуў. А яшчэ казалі, што крапіву пракляў Бог, а д'ябал у пакаранне людзям паўсюль развеяў яе насенне. Калі крапіва буяе, гэта азначае смерць і заняпад. «Крапіва там хутка расце», — так выказваліся пра хату, пабудаваную не на тым месцы.

Зазвычай крапіву развешвалі на вокнах, пакідалі на парозе жытла, у хляве і іншых гаспадарчых пабудовах напярэдадні свята Купалы. Лічылася, што гэта надзейная ахова ад ведзьмакоў ды нячысцікаў.

Добра ведалі нашы продкі і пра лекавыя якасці крапівы.

Крапівы сустракаецца некалькіх відаў: двудомная *(Urtica dioica L.)* і жыгучка — пякучая крапіва з дробным круглым лісцем *(Urtico urens L.)*. «Кусаецца» расліна доўгімі пякучымі валаскамі.

Па ўтрыманні карысных для чалавека рэчываў лісце абодвух відаў крапівы падобнае. Крапіва з'яўляецца добрым агульнаўмацавальным сродкам, паляпшае абмен рэчываў. Дапамагае ў лячэнні хвароб сістэмы стрававання, алергіі, анеміі, атэрасклерозу.

У народнай медыцыне шырока выкарыстоўваюцца абодва віды. Адвар травы п'юць як кроваспыняльны і мачагонны сродак, для апетыту, пры нервовым расстройстве, коклюшы, удушшы, рэўматызме. Карысны адвар і прымочкі з расліны пры фурункулёзе. Карані жыгучкі, настоеныя на гарэлцы, выкарыстоўваюцца для расцірання пры рэўматызме.

Са старажытнасці крапіву ўжывалі ў ежу, у некаторых мясцовасцях у яе нават была перавага перад шчаўем і іншай зелянінай для супоў. З маладых лісцяў і парасткаў можна прыгатаваць не толькі супы, але і прыправы, і напоі, і соусы, і кандытарскія вырабы. Крапіву можна квасіць і саліць, гатаваць з яе салаты, ікру, парашок, дадаваць у амлет, катлеты, пюрэ з бульбы.

Фота Ташы Шпакоўскай.

Жыгучка.

Цікавы факт, што ў крапіве, сабранай у маі, утрымліваецца ў дзесяць разоў больш жалеза і медзі, чым у капусце, удвая болей вітаміну С, чым у парэчцы, і ў чатыры разы болей, чым у лімоне. Па ўтрыманні караціну яна пераўзыходзіць моркву, а вітаміну К — шпінат. Пры ўжыванні крапівы можна аднавіць утрыманне кальцыю ў арганізме. Збіраць трэба верхавіны расліны.

Таша ШПАКОЎСКАЯ

зваротная сувязь

Жамчужыны думкі

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя праекты. Пачуць вершы беларускіх аўтараў у праекце «Адным штрыхом» можна тройчы на дзень. Праграма «Радыёсерыял» гучыць раніцай і вечарам з панядзелка да пятніцы. Аповесць Жоржа Сіменона «Прывід на віле мсье Марба» чытае Алег Вінярскі.

Праграма «Літаратурная анталогія» прапануе старонкі апавядання Аляксея Карпюка «Пераможца». У «Радыёбібліятэцы» двойчы на дзень слухайце твор Джорджа Байрана «Дон Жуан» (пераклад Уладзіміра Скарынкіна). Суботнім вечарам выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі», з апавяданнямі айчынных і замежных аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» — вершы Анатоля Сыса.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» (пачатак эфіру ў 21.30) у выхадныя складуць заканчэнне пастаноўкі «Воўчая зграя» і пачатак спектакля «У тумане» паводле аповесцей Васіля Быкава.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». У выхадныя ў перадачы «Дзіцячы радыётэатр» выйдуць інсцэніраваная «Казка пра трох братоў, прыгажуню Атахіме і вясёлыя грыбы» паводле японскіх народных казак. Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для маленькіх.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ». У нядзелю радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» пісьменніка, публіцыста Навума Гальпяровіча прапануе сустрэчу з паэтэсай Настассяй Нарэйка. Новы выпуск праекта «Літаратура на радыё» прагучыць у чацвер.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

10 ліпеня — 110 гадоў з дня нараджэння Ніны Вайтовіч (1913—1976), беларускага мовазнаўца.

10 ліпеня — 70 гадоў з дня нараджэння Васіля Сахарчука (1953—2003), беларускага паэта, перакладчыка.

11 ліпеня — 90 гадоў з дня нараджэння Мікалая Красоўскага (1933—1989), беларускага артыста балета, педагога, заслужанага артыста БССР.

12 ліпеня — 105 гадоў з дня нараджэння Мікалая Шышкіна (1918—2000), беларускага артыста эстрады, спевака, заслужанага артыста БССР.

12 ліпеня — 70-гадовы юбілей святкуе Васіль Камароў (1953), беларускі графік.

13 ліпеня — 85 гадоў з дня нараджэння Юрыя Марухіна (1938—2001), беларускага кінааператара, рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

15 ліпеня — 85 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Шабаліна (1938—2013), беларускага публіцыста, празаіка, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь.

15 ліпеня — 85 гадоў з дня адкрыцця (1938) Дзяржаўнага тэатра лялек Рэспублікі Беларусі (да 1950 г. размяшчаўся ў Гомелі).

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк
06.07.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 797

Друкарня Рэспубліканская ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 1598

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 23027